Пролетарыі усіх краёў, злучайцеся!

РАБОТНІЦА і КАЛГАСЬНІЦА

БЕЛАРУСІ

XVIII

9892 УЦ

№ 20 (165)

1932

БССР • Дзяржаўная бібліятэка імя Леніна

ПАСЬПЯХОВА РЭАЛІЗУЕМ ПАЗЫКУ „4-га ЗАВЯРШАЮЧАГА“

Раўняцца па перадавых

У Ленінскім сельсавеце, Слуцкага раёну, арганізаваны ўдарныя брыгады па разгортваньні падпіскі на пазыку сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Гэтыя-ж брыгады разгортваюць работу па вярбоўцы ўкладчыкаў у ашчадкасу. Ужо завербавана ўкладчыкаў на 715 руб.

Першымі падпісчыкамі па Ленінскім сельсавеце зьяўляюцца:

Лемеш М. (старшыня сельсавету)—падпісаўся на 110 руб., **Праковіч Арцём** — калгасьнік, падпісаўся на 50 руб., **Млотак Эля** — калгасьніца калгасу імя Леніна, падпісалася на 25 руб., **Каналовіч**—падпісаўся на 50 р. Прысутныя настаўнікі падпісаліся на 200—210 руб. кожны.

Прэзыдыум Ленінскага сельсавету выклікае пасьледаваць гэтаму прыкладу ўсіх працаўнікоў сельсаветаў Случчыны, асьветнікаў, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў.

А. К.

Падпісаліся і выклікаюць

Дэлегацкі сход у мястэчку Шуміліна, Сіроцінскага раёну, распрацаваўшы пастанову ўраду аб выпуску новай пазыкі, горача вітае яе.

На сходзе 10 жанчын падпісаліся на 205 руб. Дэлегацкі сход вылучыў брыгаду жанчын з 5 чалавек, якія прыступілі да распаўсюджаньня пазыкі сярод жанчын мястэчка. На 1-га ліпеня дзьвюма жанчынамі — Антошкавай і Харытановіч сабрана падпіскі на пазыку на суму 1.100 р. Збор працягваецца.

Сход жанчын выклікаў на спаборніцтва жанчын саўгасу „Лясковічы“, камуны імя Сталіна, мястэчка Сіроціна. **П. Х.**

Саўгас „Івань“ ідзе ўперадзе

Рабочыя саўгасу „Івань“ (Слуцкі раён) добра зразумелі значэньне новай пазыкі і падпісаліся на пазыку больш як на 100 проц. зарплаты. (Зарплата складае 8.285 р., падпісаліся на 8.585 руб.).

Перадавыя рабочыя і работніцы падпісаліся на 120 і 150 проц. месячнага заработку.

Махнач Сьцяпан атрымлівае 90 руб. у месяц, а падпісаўся на 120 руб. **Шкляроўскі Хвядос**—атрымлівае 45 р., падпісаўся на 60 р. **Семяновіч Маня**—35 руб., падпісалася на 45 руб., **Хаванская Алена**—45 р., падпісалася на 50 руб. і інш. Уперадзе ідзе сьвінагадоўчы цэх.

Алесь.



Будаўніцтва 2 домны Днепразаводу.

За дзень завербавалі 42 падпісчыцы па пазыцы

Сход дэлегатак і жонак рабочых і служачых торфзаводу імя Даўмана, Вабальскага сельсавету, Сіроцінскага раёну, ухваліў аднагалосна падпісацца на пазыку. Падпіскі сабрана на 208 руб.

Сродкі дэлегаткі мяркуюць сабраць шляхам правядзеньня суботнікаў на торфараспрацоўках. Ужо адзін *суботнік праведзен* і даў добрыя вынікі.

Уперадзе па падпісцы ідуць дэлегаткі-жанчыны: Штукіна П., якая падпісалася на 55 руб., Кротава—на 20 р., Сіўцова—20, Іванова 20; тарфяніца Рабцава—25 руб., Скрынка—20, Барсукова—20 і інш.

З дэлегатак-жанчын складзена брыгада па вярбоўцы падпісчыц на пазыку сярод тарфяніц. Брыгада ў першы дзень сабрала 42 падпісчыцы на 740 руб. Вярбоўка працягваецца.

Сход выклікаў пасьледаваць іх прыкладу жанчын і дэлегатак Сіроцінскага раёну. **Х.**

Адказваем на выклік

У адказ на выклік калгасу „Новы быт“ на хутчэйшае правядзеньне работы па рэалізацыі пазыкі „4-ты заключны год пяцігодкі“ калгасьнікі калгасу „Прамень камуны“, Слуцкага раёну, усе як адзін падпісаліся на пазыку ня менш як на 25 р. кожны. Калгасьнікі-ўдарнікі — **Янцэвіч Хведар, Нядзелька Адар'я, Мяцельскі Алесь, Курловіч Уладзімер. Прыбытак Янка, Пратасеня Міхась, Нядзелька Лявон, Каноцька Піліп** і інш. падпісаліся на 40—50 руб. кожны.

Многія калгасьнікі тут-жа на сходзе ўносілі грошы па 10-15 р. У выніку сабрана 570 руб.

Калгасьнікі калгасу „Чырвоная горка“ ў адказ на выклік падпісаліся на суму чатыры тысячы рублёў. Адначасова ліквідавалі запазычанасьць па пазыцы „3-ці раша:очы“ на суму 1.000 руб.

А. Мельнік.

Слуцкі раён.

На вокладцы: Калгасьнікі Менскага раёну, Калодзішчанскага сельсавету, калгасу „Ударнік“ прапрацоўваюць умовы новай пазыкі 4-га заключнага году пяцігодкі.

Пастановы ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б—у масы работніц і калгасьніц

У першых лічбах (2—6) ліпеня адбыўся чарговы аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б. У парадку дня яго работ стаялі наступныя пытаньні:

1) Аб выніках веснавой сяўбы і задачах уборачнай кампаніі.

2) Аб практычных мерапрыемствах па разгортваньні савецкага гандлю і вырабе тавараў шырокага спажываньня.

3) Аб перабудове і разгортваньні арганізацыйна-партыйнай, масавай і палітвыхаваўчай работы партыі ў горадзе і на вёсцы.

Гэтыя тры пытаньні зьяўляюцца вузлавымі на даным этапе. Яны зьяўляюцца тым галоўным зьвяном, узяўшыся за якое можна з посьпехам вырашыць усю суму задач па сацыялістычным будаўніцтве.

Пленум ЦК і ЦКК, узьняўшы гэтыя важнейшыя пытаньні на прынцыповую палітычную вышыню, ва ўсёй паўнаце па кожным з іх у асобку вызначыў канкрэтныя задачы.

Абмяркоўваючы пытаньне аб выніках веснавой сяўбы і задачах уборачнай кампаніі, пленум адзначыў вялікія перамогі, атрыманыя на пасеўным фронце трэцяй бальшавіцкай вясны. У гэтым годзе засеяна значна большая плошча чым летась. Пасеўны плян 1931 году выканан у 2.326 тысяч гэктараў, а сёлета—2.543 тысячы *га*, г. зн. на 217 тыс. гэкт. больш, чым у мінулую вясну. Адначасова з гэтым у параўнаньні з мінулым годам сёлета адбыліся значныя зрухі і ў бок пашырэньня пасеву важнейшых вядучых культур.

Калгасы засеялі 1.371 тысячу *га*, калгасы, што аб'яднаюцца МТС,—486 тысяч *га* і саўгасы—169 тысяч *га*. Агулам сацыялістычны сэктар засеяў 60,6 проц. усяго яравога кліну.

Калгасы ў выніку веснавой сяўбы яшчэ больш умацаваліся палітычна і арганізацыйна-гаспадарча, паказалі далейшыя перавагі калектыўнай гаспадаркі перад аднаасобнай.

Гэтыя перамогі здабыты ў жорсткай клясавай барацьбе з кулацтвам, у барацьбе супроць правых апартуністаў—галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць „левых" загібшчыкаў і прымірэнцаў да антыленінскіх ухілаў. Гэтыя перамогі сталі магчымы толькі таму, што КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, мабілізавала ўсе свае сілы на правядзеньне трэцяй бальшавіцкай вясны і настойліва ажыцьцяўляла генэральную лінію партыі.

Пленум з усёй выразнасьцю паказаў і на рад тых недахопаў, якія выяўлены ў ходзе сяўбы. Асноўныя з гэтых недахопаў заключаюцца ў наступным: у пэрыяд падрыхтоўкі да сяўбы з боку цэнтральных і раённых савецкіх, зямельных і калгасных органаў ня было выстарчальнага апэрацыйнага кіраўніцтва; кепска было пастаўлена плянаваньне і ўлік, наглядалася слабасьць масава-палітычнай работы; у радзе месц дрэнна былі расстаўлены сілы; адсутнічала належная барацьба за павышэньне ўраджайнасьці.

Даўшы глыбокі аналіз ходу веснавой сяўбы, пленум высунуў перад партыйнымі арганізацыямі надзвычай адказныя задачы па правядзеньні праполкі і ўборкі ўраджаю.

т. Гікало—першы сакратар ЦК КП(б)Б.

ЛІЧНА БІБЛІОТЕКА ОДЕСА 12 32
XVIII
9892

Галоўнай задачай усіх арганізацый зьяўляецца барацьба за сваячасовасьць і якасьць уборкі, барацьба са стратамі ўраджаю. Роля сельска-гаспадарчай работніцы і калгасьніцы і працоўных сялянак-аднаасобніц у ажыцьцяўленьні гэтай задачы надзвычай вялікая і адказная.

Работніцы саўгасаў, МТС і калгасьніцы павінны прыняць актыўны ўдзел у праверцы таго, наколькі ўкаранілася зьдзельшчына ва ўсе галіны работы, наколькі ліквідавана абязьлічка і ўраўнілаўка. Задача работніц і калгасьніц—разгарнуць шырокую работу па ўдасканаленьні вытворчых заданьняў, па ўмацаваньні брыгады і павышэньні прадукцыйнасьці і якасьці яе работы. Праца ва ўсёй сельска-гаспадарчай вытворчасьці павінна быць арганізавана так, каб яна яшчэ ў большай меры павышала зацікаўленасьць кожнай брыгады і калгасьніка ў рэзультатах сваёй работы.

Пленум ЦК і ЦКК устанавіў канкрэтныя заданьні і тэрміны па правядзеньні асноўных сельска-гаспадарчых работ. Гэтыя заданьні, даныя ў пастанове пленуму, трэба давесьці да кожнай работніцы саўгасу, МТС і калгасьніцы і працоўных аднаасобніц.

Спэцыяльна пленум зьвярнуў увагу партыйных арганізацый на будаўніцтва культурна-бытавых устаноў у калгасах (клюбы, сталоўкі, дзіцячыя ясьлі, пляцоўкі і г. д.).

Заданьне ў гэтай галіне павінна быць поўнасьцю выканана. Трэба арганізаваць ня менш 5.599 дзіцячых ясьляй, 2.074 пляцовак і 1.829 сталовак. Гэта можа быць выканана толькі тады, калі с.-г. работніцы і калгасьніцы праявяць вялі-

кую актыўнасьць у рэалізацыі дырэктыў пленуму ЦК і ЦКК.

Па пытаньні аб практычных мерапрыемствах па разгортваньні савецкага гандлю і вырабу тавараў шырокага спажываньня пленум ЦК і ЦКК адзначыў рад станоўчых вынікаў, якія ўжо набыты ў гэтай галіне. З часу апублікаваньня пастановы ЦК УсеКП(б) аб збожжа і жывёла-загатоўках, аб разгортваньні калгаснага гандлю ўзмацніўся прыцёк сельска-гаспадарчых прадуктаў на рынках, намеціўся працэс зьніжэньня рыначных цэн. Разам з гэтым пленум падкрэсьліў, што рэалізацыя дырэктыў партыі па разгортваньні калгаснага гандлю праходзіць яўна нездавальняюча.

Некаторыя раённыя партарганізацыі, савецкія, калгасныя і вымельныя ўстановы не разгарнулі адпаведнай масавай работы, шчыльна не падыйшлі да ажыцьцяўленьня канкрэтных мерапрыемстваў па разгортваньні калгаснага гандлю. Каапэрацыйна-гандлёвыя аб'яднаньні не праяўляюць патрэбнай гібкасьці ў тым, каб сустрэць паток с.-г. прадуктаў на рынак прамтаварамі. У радзе месц не вядзецца яшчэ рашучая барацьба з перакупшчыкамі, спэкулянтамі.

З асаблівай рашучасьцю пленум падкрэсьліў зусім павольнае разгортваньне вырабу прадметаў шырокага спажываньня. Прадпрыемствы лёгкай прамысловасьці, прамысловая каапэрацыя не забясьпечылі выкананьня дырэктыў партыі і ўраду, не аддалі належнай увагі выпуску тавараў шырокага спажываньня. Дзе-ні дзе наглядалася простая недаацэнка гэтай важнейшай справы.

У радзе месц (Барысаў, Бабруйск і інш.) мелі месца факты скажэньня дырэктыў партыі аб разгортваньні гандлю.

Мабілізуючы ўсю КП(б)Б на барацьбу з апартуністычнай недаацэнкай разгортваньня калгаснага гандлю, са спробамі „левакоў" падмяніць гандаль простым прадуктаабменам, пленум абавязаў усе партыйныя арганізацыі больш узмоцнена праводзіць у жыцьцё канкрэтныя мерапрыемствы, накіраваныя на выкананьне пастаноў ЦК УсеКП(б) (устанаўленьне базарных дзён, прывядзеньне ў парадак рыначных плошчаў, пабудова ларкоў, наладжваньне культурнага абслугоўваньня і г. д.). Пастанова пленуму абавязвае гаспадарчыя арганізацыі поўнасьцю выканаць дадатковую праграму на другое паўгодзьдзе вырабу тавараў шырокага спажываньня на суму 30.605.480 руб.

Барацьба за рэалізацыю прынятай пленумам праграмы вырабу прадметаў шырокага спажываньня зьяўляецца справай гонару кожнай работніцы. Гэта пытаньне трэба абмеркаваць на дэлегацкіх сходах прадпрыемстваў з тым, каб павысіць актыўнасьць дэлегатак і наогул работніц на гэтым адказьнейшым вучастку работы.

Разгортваньне калгаснага гандлю патрабуе ўзмацненьня гандлёвай дзейнасьці каапэрацыйных аб'яднаньняў. Яны павінны праявіць максымум паваротлівасьці, каб арганізаваць прасоўваньне прадметаў шырокага спажываньня ў вёску, каб пашырыць таваразварот. Задача работніц і калгасьніц—прымаць больш актыўны ўдзел у рабоце каапэрацыі, дабівацца гібкасьці і выразнасьці ў яе рабоце.

Ва ўсёй шырыні было пастаўлена і ўсебакова абмеркавана пытаньне **аб перабудове і разгортваньні арганізацыйна-партыйнай, масавай і палітвыхаваўчай работы.**

КП(б)Б за апошнія гады нябывала выраслa колькасна і якасна. Павысіўся ідэйна-*палітычны* ўзровень партыйных арганізацый. Яшчэ больш умацавана сувязь з масамі пралетарыяту і працоўнага сялянства. Партыйныя арганізацыі ў барацьбе на два фронты супроць правых і „левых" апартуністаў і прымірэнцаў яшчэ шчыльней згуртаваліся вакол ленінскага ЦК УсеКП(б) і правадыра партыі тав. Сталіна.

Але задачы, якія стаяць перад партыяй на даным этапе, патрабуюць ад партыйных арганізацый далейшай перабудовы сваёй работы, уздыму на яшчэ больш высокую ступень арганізацыйнай, партыйна-выхаваўчай і масава-палітычнай работы. На гэтых трох вузлавых пытаньнях партыйнай работы пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б мабілізаваў увагу КП(б)Б. Асаблівая ўвага ў пастановах пленуму зьвернута на ўмацаваньне сярэдняга зьвяна, на падрыхтоўку да партыйных дзён, на партыйна-выхаваўчую работу, асабліва сярод новага папаўненьня. Пленум паставіў задачу перад партыйнымі арганізацыямі ахапіць масава-палітычнай работай кожнага рабочага і работніцу, шырока разгарнуць палітычную агітацыю ў масах калгасьнікаў і калгасьніц. Пленум абавязаў партыйныя арганізацыі ў найкарацейшы тэрмін перабудаваць масавую работу і агітацыю ў адпаведнасьці з узросшай актыўнасьцю і запатрабаваньнямі рабочых і калгасных мас.

Вялікую ўвагу пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б аддаў пытаньню палітычна-масавай работы сярод жанчын. Пастановай падкрэсьлена, што работа сярод жанчын ня стала справай усіх зьвеньняў партыйных, савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый. У радзе выпадкаў гэта адказьнейшая работа ўскладзена толькі на адных жанарганізатараў. У некаторых раёнах былі факты простай недаацэнкі работы сярод жанчын.

Пленум абавязаў партыйныя арганізацыі забясьпечыць бесьперабойную работу дэлегацкіх сходаў у горадзе і на вёсцы. Зьмест і якасьць гэтай работы павінны быць падняты на яшчэ большы палітычны ўзровень. Работніцам і калгасьніцам-дэлегаткам трэба дабіцца ад мясцовых ячэек, каб дэлегацкія сходы былі забясьпечаны кіраўнікамі з ліку лепшых, найбольш падрыхтаваных партыйцаў.

Адначасова партыйным арганізацыям на мясцох трэба забясьпечыць сыстэматычную падрыхтоўку і перападрыхтоўку кіраўнікоў-арганізатараў дэлегацкіх сходаў, не адрываючы іх ад вытворчасьці.

Работа сярод жанчын, як і ўся палітычна-масавая работа, павінна быць строга дыфэрэнцыявана, прыстасавана да асобных груп работніц і калгасьніц.

Пастановы пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б зьяўляюцца разгорнутай праграмай барацьбы партыйных арганізацый і шырокіх мас работніц і калгасьніц за новыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтымі пастановамі трэба неадкладна ўзброіць кожную работніцу і калгасьніцу. На дэлегацкіх сходах, у гурткох трэба шырока прапрацаваць і вывучыць пастановы пленуму, давесьці іх да самых шырокіх мас. Зусім зразумела, што прапрацоўка і глыбокае вывучэньне пастаноў павінны быць зьвязаны з правядзеньнем канкрэтных мерапрыемстваў ва ўмовах кожнага прадпрыемства—саўгасу і калгасу, накіраваных на іх поўнае ажыцьцяўленьне.

А. К.

БАРАЦЬБІТУ ЗА СПРАВУ ПРАЛЕТАРЫЯТУ — КЛАРЫ ЦЭТКІН
ПАЛКАЕ БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ Ў ДЗЕНЬ 75-ГОДЗЬДЗЯ

РЭВАЛЮЦЫЯНЭРКА-ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТКА

Германская сацыял-дэмакратычная партыя была заснавана Бэбэлем і Вільгельмам Лібкнэхтам, вучнямі К. Маркса, у 1869 г. Яна імкнулася згуртаваць германскі пралетарыят, падняць яго на змаганьне. У 1878 годзе ў Германіі быў выдан закон супроць сацыялістаў, але партыя не развалілася, а пайшла ў падпольле, пачала выдаваць за мяжой—у Швэйцарыі—партыйны орган „Социал-демократ", які нелегальна ўвозіўся ў Германію. Калі ў 1890 г. быў скасаваны закон супроць сацыялістаў, германская сацыял-дэмакратыя разгарнула шырокую прапаганду і агітацыю, усяляк скарыстоўваючы парляманцкую трыбуну. Клара Цэткін была актыўным членам партыі.

У тыя часы нават унутры с.-д. партыі погляды на жанчыну, на ўцягненьне жанчын-работніц у рух былі вельмі адсталымі, і Клары прышлося горача змагацца на гэтым фронце. Германская с.-д. партыя многа зрабіла для аднаўленьня Інтэрнацыяналу, і на І кангрэсе гэтага адноўленага Інтэрнацыяналу ў 1889 г. Клара выступала з дакладам аб неабходнасьці дабіцца для жанчыны права ўдзелу ў палітычным жыцьці. З 1891 г. у Германіі пачаў выходзіць пад рэдакцыяй Цэткін, с.-д. журнал „Роўнасьць".

У нас, у Расіі, у 90-я гады толькі-толькі пачаў узьнімацца рабочы рух, ня было яшчэ партыі і зразумела, якое вялікае значэньне меў для нас вопыт германскай сацыял-дэмакратыі. Для сацыял-дэмакратаў пачатку 90-х гадоў імёны Бэбэля, Вільгельма Лібкнэхта, Мэрынга, Цэткін былі акружаны арэолям, былі дарагі і блізкі.

Клара Цэткін аднэй з першых становіцца ў рады змагароў з апартунізмам і бэрнштэйніянцамі, з Фольмарам. У сваёй рабоце „Шаг вперед, два шага назад", у якой Ільліч апісвае раскол на II зьезьдзе, ён падае словы Цэткін, якая сказала Бэбэлю ў 1895 г.—„горка мне бачыць цябе ў такой кампаніі" (г. зн. у кампаніі з Фольмарам і іншымі апартуністамі).

Уладзімер Ільліч першы раз бачыў Цэткін у Мюнхэне, потым яны змагаліся поруч у 1907 г. у Штутгарце на міжнародным сацыялістычным кангрэсе. Аб гэтым кангрэсе Уладзімер Ільліч пісаў: „У агульным і цэлым Штутгарцкі зьезд рэльефна супаставіў па цэламу раду буйнейшых пытаньняў апартуністычнае і рэвалюцыйнае крыло

Клара Цэткін.

міжнароднай сацыял-дэмакратыі і даў вырашэньне гэтых пытаньняў у духу рэвалюцыйнага марксызму".

Ільліч напісаў два артыкулы аб Штутгарцкім кангрэсе і ў абодвых гаворыць аб Цэткін, аб тым, як яна правільна выступала супроць Пляханава, які абараняў нэйтральнасьць прафсаюзаў і тым самым станавіўся на шлях разьмежаваньня эканамічнага і палітычнага змаганьня: падае вытрымку з артыкулу Цэткін наконт рэзалюцыі аб антымілітарызьме, гаворачы, што тут узята самая характэрная і важная рыса рэзалюцыі:

„І тут,—гаварыла Цэткін аб антымілітарысцкай рэзалюцыі,—перамагла, нарэшце, рэвалюцыйная энэргія і мужная вера рабочай клясы ў сваю здольнасць да барацьбы,—перамагло, з аднаго боку, пэсымістычнае эвангельле бясьсільля і закасьцянелае імкненьне абмежавацца старымі, выключна парляманцкімі спосабамі барацьбы, а з другога боку, перамог і праставаты антымілітарысцкі спорт французскіх паўанархістаў накшталт Эрвэ. Рэзалюцыя, прынятая, нарэшце, аднагалосна і камісіяй і амаль 900 дэлегатаў усіх краін, выказвае ў энэргічных словах гіганцкі ўздым рэвалюцыйнага рабочага руху з часу апошняга міжнароднага зьезду; рэзалюцыя высоўвае як прынцып пралетарскай тактыкі яе гібкасьць, яе здольнасьць да разьвіцьця, яе абвастрэньне па меры высьпяваньня ўмоў для гэтага".

Падае Ленін цытату з Цэткін і па пытаньні аб пазыцыі нямецкіх с.-д.:

„У Штутгарце няпрыемным апартуністычным дысанансам гучэлі прамовы Фольмара ў камісіі аб мілітарызьме, Пеплава ў камісіі аб эміграцыі, Давіда (а таксама, дадамо ад сябе, і Бэрнштэйна) у калёніяльнай камісіі. У большасьці камісій па большасьці пытаньняў прадстаўнікі Германіі былі на гэты раз важакамі апартунізму".

Адзначыў Уладзімер Ільліч і работу Цэткін на першай міжнароднай сацыялістычнай канфэрэнцыі жанчын, адзначыў яе барацьбу з апартуністычным падыходам аўстрыйцаў да пытаньня аб выбарчых правох жанчын.

Калі ў 1914 г. выбухнула імпэрыялістычная вайна, наша фракцыя ў дзяржаўнай думе павяла рэвалюцыйную прапаганду супроць вайны і царскага ўраду. За сваю рэвалюцыйную работу фракцыя была арыштавана і саслана ў Сібір. У сваім артыкуле наконт гэтага Ленін пісаў:

„Сацыялісты Германіі, якія не перайшлі на бок буржуазіі, абвясьцілі друкавана, што лічаць „геройскай" тактыку расійскай с.-д. рабочай партыі. У Германіі выдаюцца нелегальна адозвы супроць вайны і супроць ураду. Дзесяткі і сотні лепшых сацыялістаў Германіі, у тым ліку вядомая прадстаўніца жаночага рабочага руху Клара Цэткін кінуты нямецкім урадам у турмы за прапаганду ў рэвалюцыйным духу".

Ільліч разышоўся з Цэткін па пытаньні аб тактыцы, якой трэба было трымацца на жаночай міжнароднай сацыялістычнай канфэрэнцыі, але гэтыя разгалосьсі хутка адыйшлі ў мінулае. Калі бальшавікі ўзялі ўладу, нямецкае левае крыло стала на іх абарону.

„Тым больш цяжкае наша становішча,—пісаў Ленін,—што руская рэвалюцыя аказалася ўперадзе іншых рэвалюцый, што мы не адзінокія, гэта паказваюць нам весткі, што прыходзяць да нас кожны дзень аб тым, як за бальшавікоў выказваюцца ўсе лепшыя нямецкія сацыял-дэмакраты, як за бальшавікоў у адкрытым нямецкім друку выказваецца Клара Цэткін, потым Франц Мэрынг...“

На пятым зьезьдзе саветаў Ільліч гаварыў аб тым-жа:

„Ад людзей, імёны якіх ведае кожны рабочы і селянін, як Клара Цэткін і Франц Мэрынг, бальшавіцкі ўрад атрымлівае выказваньне ўдзячнасьці і выказваньне спачуваньня і падтрыманьня“.

12 студзеня 1919 г. Ільліч пісаў:

„Калі германскі „Саюз Спартака“ з такімі сусьветна вядомымі правадырамі, з такімі вернымі прыхільнікамі рабочай клясы, як Лібкнэхт, Роза Люксэмбург, Клара Цэткін, Франц Мэрынг, парваў канчаткова сваю сувязь з сацыялістамі накшталт Шэйдэмана і Зюдэкума, з гэтымі сацыял-шавіністамі (сацыялістамі на словах, шавіністамі на справе, якія назаўсёды зганьбавалі сябе саюзам з грабежніцкай імпэрыялістычнай буржуазіяй Германіі і з Вільгельмам II), калі „Саюз Спартака“ называў сябе камуністычнай партыяй Германіі,—тады заснаваньне сапраўды пралетарскага, сапраўды інтэрнацыяналісцкага, сапраўды рэвалюцыйнага III Інтэрнацыяналу, камуністычнага інтэрнацыяналу, стала фактам. Фармальна гэта заснаваньне яшчэ не замацавана, але фактычна III Інтэрнацыянал цяпер ужо існуе“. (Т. XXIII, стар. 494).

Гэтыя радкі былі напісаны незадоўга да зьверскага забойства Карла Лібкнэхта і Розы Люксэмбург. У гэты час Клара была цяжка хворай. Толькі дзякуючы, можа быць, гэтаму яна засталася жывой. Яе бліжэйшыя прыяцелі — Роза Люксэмбург і Карл Лібкнэхт—загінулі. З іншымі, якія скаціліся да апартунізму і зрабіліся ворагамі рэвалюцыі і савецкай улады, напр. Каўцкі,—Цэткін парвала.

Цэткін зрабіла надзвычай многа для ўзьняцьця сьвядомасьці і арганізацыі працоўных жанчын. У прамовах, друку, яна абараняла заўсёды ўраўнаньне жанчын з мужчынай у выбарчых правох, яна змагалася за ўцягненьне жанчын-работніц у палітычную барацьбу, рабіла ўсё магчымае для ўзьняцьця яе сьвядомасьці, доўгія гады была рэдактарам жаночага журналу „Роўнасьць“. У часе Штутгарцкага кангрэсу 1907 г. адбывалася першая міжнародная канфэрэнцыя жанчын-сацыялістак. На гэтай канфэрэнцыі было пастаноўлена стварыць міжнародны жаночы сацыялістычны сакратарыят, у якім кожная сацыялістычная партыя мела-б свайго прадстаўніка — карэспандэнтку. Міжнародным сакратаром сацыялістычных жанчын выбрана была Клара Цэткін. Клара была ня толькі добрым прапагандыстам і агітатарам, яна была таксама добрым арганізатарам.

Праз 3 гады, у 1910 г. улетку ў Капэнгагене адбылася другая канфэрэнцыя сацыялістак, якая пастанавіла ўстанавіць 8 сакавіка міжнародны жаночы дзень. Уплыў Цэткін на жаночы пралетарыят быў надзвычай вялікі.

На другі кангрэс III Інтэрнацыяналу Цэткін прыехаць не магла. Яе выбралі ў рэйхстаг, і яна павінна была ўпяршыню выступіць там з прамоваю. Яна выступіла, салідарызавалася ў сваім выступленьні з савецкай уладай, гаварыла прамову ў абарону яе. Яна прыехала ў РСФСР крыху пазьней, у канцы верасьня. У гэты час у Сьвярдлоўскай залі Крамля адбывалася IX партканфэрэнцыя. Таварышы ўспамінаюць, калі Цэткін вышла на трыбуну пад гром аплёдысмэнтаў канфэрэнцыі. Ільліч горача абняў яе.

Цэткін прагна ўбірала ў сябе ўражаньні, якія наскрозь дыхалі рэвалюцыяй краіны Саветаў, якая стала ёй з тых часоў роднай. Да Цэткін пацягнуліся з усіх бакоў нашы жаночыя дэлегаткі—работніцы, сялянкі, асаблівa нацмэнкі. Цэткін, так многа зрабіўшая для рабочага руху сваёй краіны, так многа зрабіўшая для міжнароднага змаганьня пралетарыяту, так многа зрабіўшая для таго, каб узьняць сьвядомасьць працоўных жанчын ва ўсім сьвеце, дапамагчы ім арганізавацца,—была для іх увасабленьнем рэвалюцыянэркі-інтэрнацыяналісткі. Многа зрабіла яна для нас. На III кангрэсе Камінтэрну была выбрана ў члены прэзыдыуму ВККІ, і ўсе гэтыя гады актыўна працавала ў германскай кампартыі.

5 ліпеня г. г. ёй споўнілася 75 год. Яна такая-ж, як і раней, палкая рэвалюцыянэрка, таксама, як і раней, аддае ўсе свае сілы справе пралетарыяту.

Пажадаем ёй сілы і здароўя. Няхай прыме яна наша гарачае прыяцельскае прывітаньне.

Н. Крупская.

„Праўда“.

ЦК УсеКП(б)—тав. Клары Цэткін

Вэтэрану міжнароднага рабочага руху, палкаму трыбуну пралетарскай рэвалюцыі, старэйшаму правадыру Камуністычнага Інтэрнацыяналу, сябру і таварышу працоўных мас СССР, змагару за разьняволеньне жанчын-работніц—Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) шле ў дзень 75-годзьдзя гарачае бальшавіцкае прывітаньне.

Паплечніца Энгельса, ты нястомна змагалася супроць апартунізму ў II Інтэрнацыянале, з усёй сілай свайго вялікага розуму і рэвалюцыйнага запалу ты паўстала супроць бэрнштэйніянства, супроць рэвізіянізму. У дні, калі выбухнула сусьветная бойня, калі сталпы II Інтэрнацыяналу ганебна ўпраглісь ў калясьніцу імпэрыялізму, ты разам з Леніным, разам з Розай Люксэмбург і Карлам Лібкнэхтам высока ўзьняла сьцяг пралетарскага інтэрнацыяналізму. Ты была з намі ў дні Кастрычніка, і ў дні грамадзянскіх баёў, калі сусьветная контр-рэвалюцыя прабавала задушыць першую ў сьвеце дзяржаву пралетарыяту. Самаадданы прыяцель СССР, ты заўсёды на баявым пасту, калі вораг пагражае краіне саветаў.

Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) выказвае сваё гарачае пажаданьне і цьвёрдую ўпэўненасьць у тым, што ты яшчэ многія гады будзеш змагацца ў першых радох Камуністычнага Інтэрнацыяналу.

ЦК УсеКП(б).

Актыўныя ўдзельніцы сацыялістычнага будаўніцтва

Іх многа на сэсіі ЦВК. Сядзяць і ўдумлена слухаюць словы прамоўцаў. Часамі ў такт словам каторая ківае галавой. Большасьць з іх немаладыя. Ва ўсіх іх ёсьць адно агульнае—гэта цяжкі працоўны шлях мінулага. Жыцьцё было для іх ня ласкавай маткаю, а сярдзітай мачыхай.

Аўдоля Сініцкая.

Расказваючы аб сваім мінулым, горача і хутка гаворыць, нібы хоча хутчэй адмахнуцца ад гэтага мінулага і поўнасьцю аддацца сучаснаму сёнешняму дню.

„Мяне з дзіцем і мужам абшарнік Міларадаў выгнаў з вёскі таму, што ён не хацеў дзяржаць на сваё зямлі бедняка. Мне ня было куды падзецца, пасялілася з сям'ёй у хлеве, разам з жывёлай. Так мы жылі на працягу цэлага году. Дзіця ад прастуды захварэла і засталося на ўсё жыцьцё калекай".

У хуткім часе муж пайшоў на японскую вайну і пакінуў Аўдолю з хворым дзіцем.

Застаўшыся адна, Аўдоля пакідала сваё дзіця ў хлеве, а сама хадзіла да абшарніка працаваць за 20 кап. у дзень. Працавала па 12-14 гадзін у дзень.

— Калі вярнуўся мой гаспадар з японскай вайны праз паўтары гады, трохі паменшыліся мае клопаты, але-ж доўга ня прышлося жыць разам з мужам, бо зноў забралі на другую вайну—германскую. Прабыўшы пяць год у палоне, вярнуўся хворым інвалідам, няздольным зарабіць нават на кавалак хлеба.

Першы раз я пачула на сходзе слова „калгас" ад прадстаўніка раёну. Мяне зацікавіла, я пачала пытацца: „Таварыш, скажы, ці лепш будзе жыць у калгасе" Ён дэтальна растлумачваў пра жыцьцё ў калгасе і пра ўсе выгады буйнай калектыўнай гаспадаркі.

— Разважала я нядоўга, бо вельмі ўжо цяжка мне жылося. Парашыла я, што горш быць ня можа, і пачала праводзіць штодзенныя гутаркі сярод вакольных працоўных сялянак, каб ішлі ў калгас.

Такім чынам у канцы 1929 году я арганізавала калгас „Чырвоны сьцяг" з сямі гаспадарак. Мяне вылучылі старшынёй калгасу. У калгас увайшла ўся беднота і працавала добрасумленна. Паказвалі ўзорныя прыклады работы аднаасобнаму сэктару. Наш калгас увесь час добра спраўляецца з работай.—Як у мінулым, так і сёлета раней другіх калгасаў скончылі веснавую сяўбу. Плян выканалі з перавыкананьнем на 5 *га* тэхкультур.

Зараз скончылі праполку і прыступілі да сенаўборкі. Я ўпэўнена, што мы з посьпехам управімся з уборкай ураджаю. У часе сяўбы наш калгас меў прыліў 3 гаспадаркі і 5 адзіночак. Зараз у калгасе ёсьць 30 гаспадарак.

І гэта немаладая, лепшая актывістка-калгасьніца з гонарам заяўляе, што яна ўжо пісьменная.

Лётчык-ударніца тав. Казарынова. Мае шмат узнагарод за ўдарную працу ў паветры.

Значок ЦВК квітнее ў яе на грудзях. Яна член ЦВК, актыўная ўдзельніца ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній на вёсцы. Аўдоля абяцае стаць актыўнай сялькоркай часопісі.

Шалабанава Марыля нават пакрыўдзілася, калі яе запыталі, ці зьяўляецца яна калгасьніцай. „Як-жа ня быць калгасьніцай члену ЦВК?"—адказала яна.

— З сямігадовага ўзросту,—кажа тав. Шалабанава,—пачала я працаваць па людзях. 20 доўгіх год батрацкай працы многаму навучылі. У вёсцы Глінкі 8 год пасьвіла жывёлу кулакам. Надакучыла пасьвіць, пайшла на працу да абшарніка Балінскага, дзе атрымлівала ў год 6 руб.

У 1929 годзе ў вёсцы арганізаваўся калгас „Іскра" і Марыля першая ўступіла ў калгас.

На 50-м годзе ліквідавала сваю няпісьменнасьць. Марыля поўная сілы і энэргіі, яна падрыхтоўваецца да ўступленьня ў рады партыі. Дзяцей сваіх выхавала ў камуністычным напрамку. Усе яны зараз зьяўляюцца лепшымі ўдарнікамі-камсамольцамі.

Лебядок Ксеня—брыгадзір калгасу „Савецкая Беларусь", Крупскага раёну, Стара-Слабодзкага сельсавету. У мінулым таксама працавала па людзях, бо зямлі ў маткі было мала і лішнія рабочыя рукі ў гаспадарцы былі непатрэбны.

Два гады Ксеня працуе ў калгасе ў якасьці брыгадзіра.

— У першы час маёй працы брыгадзірам калгасьнікі і калгасьніцы мяне ня слухалі, глядзелі як на „бабу",—расказвае Ксеня. — Прыходзілася штодзенна бегаць пад вокны калгасьнікаў і гукаць на работу, і то ня ўсе выходзілі. Ня маючы магчымасьці далей так працаваць, я паставіла гэта пытаньне на праўленьні калгасу і яно мне дапамагло. Зараз дысцыпліна наладжана, усе выходзяць на работу. За добрую работу ў калгасе мяне прэміявалі. Уступіла ў рады партыі і агітую свайго мужа, каб ён пасьледваў майму прыкладу.

Таня.

БОЛЬШ УВАГІ ПРАЦЫ ДЭЛЕГАЦКІХ СХОДАЎ

Дэлегацкі сход павінен быць школай, якая ўзьнімае палітычна-вытворчую актыўнасьць дэлегатак, дапамагае партыі перавыхоўваць новыя слаі работніц і працоўныя масы жанчын, якія яшчэ да гэтага часу не перавырыліся ў пралетарскім катле, у сьвядомых актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, мабілізуе работніц на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Пастанова ЦК УсеКП(б), апублікаваная ад 26-га чэрвеня гэтага году, аб працы жаночых дэлегацкіх сходаў, рашуча патрабуе ад партыйных, прафэсыянальных і савецкіх арганізацый зрабіць пералом у справе пастаноўкі работы і кіраўніцтва дэлегацкімі сходамі, а таксама лепшай пастаноўкі палітмасавай выхаваўчай работы сярод новых пластоў работніц, масы калгасьніц, бяднячак і сераднячак-аднаасобніц.

Агляд працы дэлегацкіх сходаў, які быў зроблен на прадпрыемствах гораду Менску—„Бальшавік", імя Молатава, „Полымя рэвалюцыі", друкарня імя Сталіна, „Усход", трыкатажная арцель імя Крупскай—паказаў, што партыйнае кіраўніцтва гэтых прадпрыемстваў не жадае працаваць па-новаму ў галіне паліт.-масавай працы сярод жанчын, не праводзіць штодзенную работу сярод работніц і жонак рабочых.

Арганізаваныя ў 1932 годзе дэлегацкія сходы не працавалі („Усход", друкарня імя Сталіна, арцель імя Крупскай, шчотачная і інш.). І новыя пласты работніц, якія прышлі на фабрыкі і заводы ў 1931-32 годзе, ня былі ахоплены палітвыхаваўчай працай.

Фабрыка „Ўсход" за 1931 год выросла з 250 да 790 работніц за лік калгасьніц і аднаасобніц з вёскі, ніякай працы з гэтымі новымі работніцамі не праводзілася. Замест масава-выхаваўчай працы сярод работніц, праф. і партКіраўніцтва фабрыкі займаліся адміністраваньнем,—каб не разышліся работніцы пасьля работы, калі быў прызначаны сход, яны замыкалі на ключ кантрольную будку і нікога не выпускалі.

Арцель імя Крупскай налічвае 300 работніц, у большасьці сваёй гэта былыя саматужніцы. Партколектыў арцелі сыстэматычна займаўся „очковтирацельством", гаворачы аб добрай працы дэлегацкіх сходаў. На справе выявілася, што дэлегацкія сходы зусім не працавалі. Ня лепш справа стаіць і ва ўсёй сыстэме Менрайпрамсаюзу, які аб'яднае каля, 4 тысячы жанчын.

Ёсьць настроі ў паасобных працаўнікоў парткалектываў, што жанпраца аджыла свой век, дэлегацкія сходы прыеліся і наогул асобнай працы з жанчынамі не патрэбна праводзіць. (Сакратар паркалектыву друкарні імя Сталіна—Цёмкін, фабрыка „Кастрычнік"—Айзэнштат, Гутман—член бюро парткалектыву арцелі імя Крупскай).

У выніку адсутнасьці палітмасавай працы сярод работніц на радзе прадпрыемстваў наглядаецца аслабленьне дысцыпліны, недавыкананьне прамфінплянаў, правал такіх вялікіх мерапрыемстваў, як рэалізацыя пазыкі „4-га заключнага году пяцігодкі".

На фабрыцы „Ўсход" сыстэматычна ня выконваецца прамфінплян. Меліся выпадкі пакраж з боку работніц. Шчотачная фабрыка ў цэлым адстае ў рэалізацыі пазыкі. На заводзе імя Молатава ёсьць выпадкі, калі работніца-камсамолка Каранкевіч адмовілася ад падпіскі на пазыку.

На радзе прадпрыемстваў ёсьць добрыя ўзорныя прыклады працы паасобных брыгад і ўдарніц, але-ж праца іх не папулярызуецца, іх вопыт не перадаецца. На шчотачнай фабрыцы гаспадарча-разрахунковыя брыгады—Голуб, Юспы і Крыловіч—паказалі прыклады бальшавіцкай барацьбы за прамфінплян. За адзін месяц яны далі эканоміі на 1.076 руб. 46 кап. На пазыку падпісаліся на 120 проц. зарплаты. Работніца Шэр з заводу імя Молатава прышла на завод няпісьменнай, яна ліквідавала сваю няпісьменнасьць, першай падпісалася на пазыку і выклікала на сацспаборніцтва іншых работніц. Такіх прыкладаў можна было прывесьці многа. На жаль, яны не скарыстоўваюцца і на гэтых прыкладах ня выхоўваюцца масы новых работніц.

У мінулым годзе ў друкарні імя Сталіна добра працавалі два дэлегацкія сходы—адзін на яўрэйскай мове, другі на беларускай. Вынікі працы былі ў наяўнасьці. У рады партыі ўліліся лепшыя дэлегаткі-ўдарніцы. Зараз наглядаецца вельмі слабы рост за лік работніц.

З вылучэньнем работніц на кіруючыя пасады справа стаіць ня зусім добра. Вылучэнкам ніякай дапамогі ў працы не аказваюць і работніцы часта неахвотна ідуць на вылучэньне. Ёсьць выпадкі, калі кідаюць кіруючую працу і варочаюцца да варштату.

На фабрыцы „Усход" работніца-вылучэнка Грэдэр кінула кіруючую працу і зьвярнулася да варштату, бо ніадкуль дапамогі ў працы ня мела.

Брыгада імя 8 сакавіка; на чале брыгады т. Крайс.
Завод „Чырвоны Зодак", г. Менск.

Кіраўніцтва дэлегацкімі сходамі з боку партарганізацыі амаль зусім адсутнічае, у наяўнасьці поўная недаацэнка працы сярод жанчын.

На фабрыцы „Ўсход“, друкарні імя Сталіна, завод імя Молатава, „Полымя рэвалюцыі“, арцелі імя Крупскай партарганізацыямі ні разу не заслухоўваліся пытаньні жанпрацы.

Жанорг заводу „Полымя рэвалюцыі“ тав. Белякоўская падкрэсьліла, што парткалектыў зусім не дапамагае ў наладжаньні работы сярод жанчын. Кніжкі ўдарнікаў выдаюцца няправільна, не сапраўдным ударнікам, а тым, хто працуе звыштэрмінова.

Вельмі частая зьмена жаноргаў таксама спрыяла развалу жанпрацы: завод „Бальшавік“, „Полымя рэвалюцыі“, друкарня імя Сталіна і завод імя Молатава“, дзе жанарганізатары мяняліся кожныя два месяцы.

Сакратар парткалектыву друкарні імя Сталіна тав. Цёмкін даўно шукае жанорга і ніяк ня можа знайсьці ў той час, як у парткалектыве друкарні ёсьць добра палітычна-асьвечаныя работніцы-партыйкі.

Жаноргі цяперашняга складу мала адпавядаюць свайму прызначэньню з прычыны слабай палітычнай асьвечанасьці.

Значная доля віны за развал жанпрацы падае і на Менскі ГК, які, ведаючы аб адсутнасьці працы дэлегацкіх сходаў, ніякіх рашучых захадаў не рабіў, апрача скліканьня нарад жаноргаў і пасылкі брыгад камвузаўцаў у паасобныя прадпрыемствы.

Патрэбна ўнесьці яснасьць у пытаньне—ці павінны арганізоўвацца дэлегацкія сходы на прадпрыемствах, дзе пераважная большасьць работніц (70—90 процантаў).

Чэрвеньская пастанова ЦК УсеКП(б)Б рашуча ставіць пытаньне аб узмацненьні парткіраўніцтва дэлегацкімі сходамі і наладжаньня іх працы.

Трэба гаркому ўказаць партарганізацыям заводу імя Молатава, „Полымя рэвалюцыі“, друкарні імя Сталіна, шчотачнай фабрыкі, арцелі імя Крупскай і інш., што жанпраца адна з асноўных галін партработы. Пара палажыць канец недаацэнцы працы сярод жанчын.

Г. і Ш.

Тав. Гурвіч лепшая ўдарніца жэлацінnага цэху заводу „Бальшавік“.

На заводзе Імя Лекерта жанпрацай ніхто ня цікавіцца

Работніцы заводу імя Лекерта ня памятаюць, быў у іх дэлегацкі сход, ці не. Яны добра памятаюць і ведаюць, што праца на заводзе як сярод работніц, так і жонак рабочых зусім адсутнічае. Аб гэтым работніцы гавораць упэўнена. Ды што словы, словам ня кожны паверыць, а факты гэта зусім другая справа і іх ёсьць даволі. Вось яны.

Ці ведалі работніцы фабрыкі аб сталінскім паходзе — ня ведалі і таму ніякага ўдзелу ў ім ня прымалі.

З павышэньнем кваліфікацыі работніц справа зусім дрэнная. Рад пастаноў ёсьць па гэтым пытаньні на заводзе і досыць добрых, але справа ні на крок ня зрушылася. Ні адна работніца ня ведае выпадку, калі-б работніцу на заводзе перавялі на вышэйшую кваліфікацыю.

Жанорг ёсьць, але як ня дзіўна, мусіць аб гэтым забыўся парткалектыў, бо на бюро яе амаль ніколі не завуць і членам бюро яна не зьяўляецца.

ЦК УсеКП(б) у сваёй чэрвеньскай пастанове аб рабоце дэлегацкіх сходаў рашуча ставіць пытаньне, каб „забясьпечыць сыстэматычную работу нова-выбраных у 1932 годзе дэлегацкіх сходаў у горадзе і вёсцы“ і „партячэйкам вылучыць пастаянных кіраўнікоў-арганізатараў дэлегацкіх сходаў са складу палітычна-падрыхтаваных партыйцаў, на ўзроўні ня ніжэй ячэйкавых прапагандыстаў“.

Пастанова ЦК неадкладна павінна быць праведзена ў жыцьцё.

Брыгада ўдарніц друку:
Курыч, Нідэльман і Фрайнфэльд

г. Віцебск.

ДЭЛЕГАТКІ, РАБОТНІЦЫ І КАЛГАСЬНІЦЫ!

Вашай практычнай дапамогі патрабуюць дзіцячыя бытавыя ўстановы—ясьлі і сады, сталоўкі, магазыны ЗРК, прыгарадныя гаспадаркі, сьвінарнікі, трусятнікі, пякарні і хлебазаводы

Дэлегаткі змагаюцца за палепшаньне бытавых умоў работніц і калгасьніц

Дэлегацкія сходы спаборнічаюць

Дэлегаткі мястэчка Плешчаніцы, рыхтуючыся да ўборачнай, абвясьцілі сябе ўдарніцамі па дапамозе калгасам ва ўборачнай кампаніі. Практычна яны ажыцьцявілі гэта так: разьбіліся на некалькі брыгад, вылучылі старшых брыгадзіраў і брыгады прымацавалі да паасобных калгасаў.

Дэлегаткі выклікалі на сацспаборніцтва дэлегатак Акалоўскага сельсавету і ўзялі на сябе абавязкі:

Дэтальна распрацаваць пастановы партыі і ўраду аб збожжа і мясазагатоўках, калгасным гандлі і сельгаспадатку, каб умець добра растлумачыць калгасьніцам.

Акуратна наведваць прымацаваныя калгасы і дапамагчы ім у працы, як у арганізацыйнай, так і ў практычнай—па ўборцы.

Дапамагчы ў прымацаваных калгасах арганізаваць ясьлі і пляцоўкі, каб забясьпечыць выхад усіх працаздольных жанчын на працу.

Адпрацаваць у карысьць палітзьняволеных суботнік.

Зоркі.

Ад рэдакцыі. Рэдакцыя чакае матар'ялаў аб выкананьні абавязацельстваў, узятых дэлегаткамі.

Работніца Бабруйскага камбінату Кухарэнка Шура—жанарганізатар цэху, перавыконвае прамфіпляп.

Дэлегацкі сход на паперы

Многа дэлегатак у Тальскім сельсавеце (Любанскі раён). Калі іх выбіралі, то гаварылі аб задачах дэлегатак, аб іх працы, намячалі добрыя пляны. Але ўсё гэта зараз забыта. Нават некаторыя ня памятаюць, выбралі іх дэлегаткамі, ці не.

Работніца Дружыніна, у выніку добрага наведваньня тэхгуртка зараз працуе на пасадзе майстра (табачная ф-ка. Керч).

Ячэйка працаю дэлегацкага сходу зусім ня цікавіцца. Па разуменьні ячэйкі—гэта такая другарадная справа, што нават і турбавацца ня прыходзіцца. Кіраўніка дэлегацкага сходу ячэйка ніколі не вылучала, мусіць спадзявалася на ініцыятыву саміх дэлегатак.

Адзіны калгас „Чырвоная горка", які ёсьць на тэрыторыі гэтага сельсавету, праполачнай яшчэ не распачынаў. Гародніна зарастае травою. Аб сацыялістычных мэтадах працы ня ведаюць. Можа ячэйка дасьць адказ, у чым тут прычына? Няўжо рабочых рук няма ў калгасе. Праўда, тут у большасьці патрэбны жаночыя рабочыя рукі.

Ш.

Ад рэдакцыі. Рэдакцыя часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі" чакае адказу ад партячэйкі Тальскага сельсавету, Любаньскага раёну.

Патрэбны ясьлі

Якаўлевіцкая суконная фабрыка перавыканала свой прамфіпляп у трэцім квартале на 115 проц., за што прэміявана 10 тысячамі руб. Грошы асыгнаваны на пабудову ясьляй. Работніцы фабрыкі ўздыхнулі, твары іх павесялелі.

— 10 тысяч, грошы не малыя,—гаварылі яны,—ясьлі павінны быць добрыя. Ня прыдзецца больш кідаць фабрыку з-за дзяцей.

Работніца Блахоціна, якая пакінула свой варштат з-за малых дзяцей, вельмі чакала ясьляй. Рад работніц хацелі пасьледваць прыкладу Блахоцінай, але ўстрымаліся, чакаючы ясьляй.

Вясною 1931 году залажылі фундамант новых ясьляй. І па сёнешні дзень стаіць гэты фундамант, далей справа ня рушыцца. Тэкстыльаб'яднаньне не пераводзіць 10 тысяч руб. і пабудова прыпынілася.

Адсутнасьць ясьляй пазбаўляе работніц магчымасьці прымаць актыўны ўдзел у грамадзкім жыцьці. Прыходзіцца пасьля працы як найхутчэй сьпяшацца дадому, дзе пакінуты адны дзеці.

Арганізаваная летняя дзіцячая пляцоўка дрэнна працуе. Абедаць дзецям прыходзіцца хадзіць у рабочую агульную сталоўку. Харчаваньне дрэннае. Адсеў дзяцей з пляцоўкі складае 40 проц.

Райана павінна пацікавіцца працай пляцоўкі, наладзіць сапраўднае снабжэньне пляцоўкі прадуктамі.

Работніцы чакаюць ад Тэкстыльаб'яднаньня высылкі прэміі ў суме 10 тысяч руб.

М.



Ганна-брыгадзірка

Апошнія праменьні сонейка абыймалі зямлю. Вясновы ветрык ледзь калыхаў дрэвы хваёвага ляска, дзе заліваўся салавей. На калгаснай вежы прабіла восем гадзін, што азначала канец работы. Калгасьніца Ганна—брыгадзір брыгады № 2—на момант спыніла сваіх коняй, кінуўшы лейцы на барану. Яна падышла да калгасьнікаў.

— Яшчэ рана ехаць дахаты, сонейка высока, будзем працаваць.

Ніхто з брыгады не пярэчыў словам брыгадзіршы Ганны, кіўнуўшы галовамі ў знак згоды, яны паехалі далей. І зноў коні Ганны пайшлі па мяккай ральлі.

Як зусім зайшло сонейка, Ганна павярнула сваіх коняй на дарогу і ўсёй брыгадай паехалі дахаты. Ва ўсіх быў вельмі добры настрой і яны жартавалі ды сьпявалі частушкі, бо сёньня, як і кожны дзень, брыгада Ганны Кандратавай перавыканала сваю норму на 35 сотых. Гэта брыгада зьяўляецца лепшай у калгасе і не дарма на бюро камсамольскай ячэйкі за добрую працу брыгадзіршу Ганну пастанавілі прэміяваць паездкай на экскурсію ў горад.

Брыгада № 2 прыехала ва двор калгасу, на якім сёньня было многа людзей. На ганку складу, дзе заўсёды пасьля працы зьбіраліся калгасьнікі, сядзеў маладзенькі рахункавод калгасу Антоська і нешта чытаў калгасьнікам з газэты. Ганна, выпрагшы каня, таксама падышла да натоўпу калгасьнікаў.

— Чаго вы тут пазьбіраліся?— запытала яна жонку палявода— Фёклу.

— Ды вось нейкі новы дэкрэт прыслалі—адказала Фёкла Ганьне. Не задаволеная такім адказам, Ганна праз людзей дабралася да Антоські, каля якога ляжала некалькі нумароў газэты. Прачытала: „**Па патрабаваньні мільёнаў працоўных мас урадам выпушчана пазыка імя 4-га заключнага году пяцігодкі**“, далей **пастанова ЦВК СССР аб выпуску новай пазыкі**. Прачытаўшы некалькі пунктаў гэтай пастановы. Ганна зразумела ролю і значэньне новай пазыкі.

Зьвечарэла. На ганку і прызьбе месца не хапала. Калі зьявіўся старшыня калгасу, распачаўся сапраўдны сход. З боку калгасьнікаў зацікаўленасьць новаю пазыкаю ўсё больш павялічвалася. Антоську закідвалі ўсё новымі і новымі пытаньнямі і ён на ўсе іх ня мог адказаць. Бачачы гэта, узялася за справу Ганна. Змораная і расчырванелая, яна пачала тлумачыць аб выпуску новай пазыкі калгасьнікам. Яе вельмі ўважліва слухалі. Гаварыла яна доўга.

„І адкуль у яе толькі бярэцца“— казаў сівенькі дзядок Ахрэм.

Сваю прамову Ганна скончыла словамі: „Я падпісваюся на пазыку „4-га заключнага году пяцігодкі“ на месячны заработак і спадзяюся, што працуючыя ў маёй брыгадзе таксама падпішуцца на месячны заработак“. Яна не памылілася, бо адразу пасыпаліся словы.

— Пішы мяне... Караткова, Цымбарэвіча і многа іншых. Брыгада № 2 выклікала брыгаду № 1 Кулінкіна на сацспаборніцтва. Некаторыя крыху мулліліся, але потым прынялі выклік брыгады № 2.

Хваля сацспаборніцтва і ўдарніцтва ахапіла ўвесь калгас. Падпісваліся дэлегаткі, падпісваліся жанчыны, якія амаль ня выходзяць на працу. Ганна, седзячы за сталом, ледзь пасьпявала запісваць. У канцы і аднаасобнікі далучыліся.

— Хоць мы і аднаасобнікі, але ня хочам адставаць ад калгасьнікаў—тлумачылі яны.

Праз 3-4 гадзіны ў калгасе, які налічваў 60 сем'яў, былі ўсе падпісчыкамі на пазыку „4 заключны год пяцігодкі“.

Позна ў гэты вечар лягла Ганна, бо пасьля афармленьня сьпісаў ёй прышлося яшчэ запісваць у кніжкі калгасьнікам сваёй брыгады выпрацоўку за пяцідзеньку. Добра яна спала ўночы, і ва сьне бачыла доўгі сьпіс прозьвішчаў калгасьнікаў і пачку асігнацый пазыкі на дзьве тысячы руб.

С. Мяжэвіч.

Аршанскі раён. Якаўлевіцкі с.-с. Калгас „X зьезд саветаў“



Старэйшая камунарка тав. З. Гаврылюкова даглядае свайго каня, да якога прымацавана (ЦЧО, Кірсанаўскі раён).

БССР Дзяржаўны музей Леніна 9

Першая тысяча ёсьць

Раніца. З-за гарызонту выкаціўся вялізарны чырвоны круг і золатам пачаў заліваць калгас „Перамогу". Густы туман, які стаяў над рэчкай, паступова расьсеяўся. У вышыні заліваўся жаўранак. Бусел, нібы гаспадар, мерным крокам абходзіў палеткі ў пошуках сьнеданьня.

Раса яшчэ ня спала і срэбрам пералівалася на сонцы.

Надвор'е абяцала быць добрым і таму Шакура (старшыня калгасу) загадаў—абед касцом везьці на поле, каб не хадзілі па сьпякоце ды і праца будзе больш прадукцыйнай.

Пачаўся працоўны дзень. Тры брыгады—Івашкевіча, Ганеўскага і Сяміжона—з касамі адправіліся на сенажаць.

— З расою толькі і касіць, дый сонца ня так смаліць,—заўважыў адзін з брыгадзіраў.

Зазьвінелі косы, роўнымі радамі лажылася трава пад узмахамі касцоў. Сонца паступова ўзьнімалася ўверх і пачынала прыпякаць.

На сушку сена крыху пазьней надыйшлі жанчыны.

Вясёлая песьня далятала да лесу, адбівалася і зноў ляцела да рэчкі і гублялася недзе за крыніцай.

— Між палеткамі дарога,
Мы ішлі туды якраз,
Мы ня веруем у бога,
Запісаліся ў калгас.

Дружна падхватвалі маладыя галасы, асабліва націскваючы на апошнія словы. З задаволенай усьмешкай нешта гаманілі пажылыя кабеціны, пазіраючы на маладых і разьмахваючы ў паветры граблямі. Дарога ішла праз балота, каля крыніцы і на сенажаць. Дзяўчаты абмылі ногі і прыступілі да працы. Як кінуць вокам вялізная сенажаць усеялася рознакалёрнымі — белымі, чырвонымі, сінімі хусткамі і сукенкамі.

Выраслі копы, маленькія і вялікія сухога, добраякаснага сена. Копы, дзе на насілках, дзе канём падцягвалі да вялізарных стагоў, якія ставіліся на зіму, частку адвозілі ў пуні.

Ударна працуюць калгасьнікі і калгасьніцы калгасу „Перамога", на чале з старшынёй калгасу тав. Шакура. Працуюць так, як працавалі на пасеўнай і на праполачнай. Ні аднаго *га* незасеянага не пакінуў калгас, плян пасеву выканаў на 100 %. Праполачная прайшла з такім-жа посьпехам як і пасеўная. 10 *га* ільну і гарод выпалалі ў самы кароткі тэрмін. Зараз уся калгасная цягавая сіла, і рабочыя пераключаны на сенаўборку — гэты адказны вучастак.

На аснове бальшавіцкіх мэтадаў — сацспаборніцтва і ўдарніцтва — брыгады па касьбе і сушцы сыстэматычна перавыконваюць нормы выпрацоўкі. Вось даведка калгаснай штодзенкі. Брыгада № 2 заданьне—1,4 *га*, выкананьне—2,25 *га*.

Брыгада № 3 заданьне—1,8 *га*, выкананьне—2,8 *га*.

Брыгада № 1 заданьне—1 *га*, выкананьне—1,5 *га*.

Асабліва вызначаюцца сваёй добрасумленнай працай ударніцы — **Латушка Зося, Шчурка Антоля,** а таксама ўдарнікі **Дразлоўскі Вінька, Івашкевіч Пятро, Шэлех Кастусь, Шчурка Васіль і Барыс.**

***

Загад старшыні аб абедзе выкананы. Цётка Паўліна Гаючэўская яшчэ з аднэй калгасьніцай фармавалі паходную кухню. Наклаўшы на воз капусты, мяса, малака, круп, хлеба, катлы, міскі, лыжкі, яны пусьціліся ў дарогу.

Каля крынічкі, пад разгатымі дрэвамі, якія стварылі патрэбны ў такую сьпякоту цянёк, разьмясьцілася паходная кухня. Запалаў агонь і булькаючы пузыркамі закіпела вада ў катлох чакаючы прыправы. Неўзабаве абед быў гатоў. З усіх канцоў сенажаці сьцякаліся калгасьніцы і калгасьнікі. Смачна паабедаўшы капусту з мясам, крупнік і запіўшы малаком калгасьнікі зноў узяліся за працу.

Моладзь жартуе, дзе-ні-дзе чуваць сьпевы і закацісты рогат на выкінуты кім-небудзь удалы жарт.

Ужо вечарэла. Ракіты над рэчкай нібы зачараваныя прытуліліся да вады і глуха перашэптваліся. Сонца садзіліся за бугор, пасылаючы апошнія позіркі на зямлю. З песьнямі калгасьнікі варочаліся дахаты. Выкупаўшыся ў халоднай крынічнай вадзе каля млыну, ішлі на адпачынак.

— Ну, першая тысяча ёсьць— сказаў Шакура, стоячы каля поўнай пуні пахучага сьвежага сена.

Ноч абыймала сваімі нябачнымі крыльлямі калгас, дзе адпачывалі людзі для заўтрашняй працы.

Чорнаморац.

Смалявіцкі раён.



Каровы з стада камуны імя Леніна (ЦЧО). Адна з іх „Красоўка" дае 448 пуд. малака ў год.

Лён зарастае травою

У калгасе „Чырвоны пуцілавец", Шумілінскага сельсавету, Сіроцінскага раёну, 15 *га* ільну раньняга засеву зарасьлі густа пустазельлем і патрабуюць неадкладнай праполкі.

Але-ж у выніку бязьдзейнасьці праўленьня калгасу і яго старшыні Міраненкі праполка не пачыналася.

У калгасе недаацэньваецца жаночая сіла, якая не скарыстоўваецца на праполцы. Яшчэ нават дагэтуль не адкрыты ясьлі.

Патрэбна неадкладна распачаць праполку ільну. Правільна расставіць і рацыянальна скарыстаць жаночую сілу ў *калгасе*, брыгадзе. Праўленьню калгасу трэба памятаць, што самая малая зацяжка праполкі—гэта ўдар па ўраджайнасьці.

П. Харытановіч

Калгасьніцы—у барацьбе за бальшавіцкі ўраджай

Ударная камсамольская брыгада

У калгасе „Перамога", Зараноўскага сельсавету, у часе веснавой пасеўнай кампаніі арганізавалася брыгада арэтых з дзяўчат камсамолак—Філіпенка Усьціны, Янкавай Ганны, Каласовай Фрузы і Захаравай Марфы.

Гэта брыгада на працягу ўсёй веснавой сяўбы паказала ўзорныя прыклады працы, па ёй раўняліся іншыя. Захопленьня энтузіязмам камсамолак да брыгады далучыліся яшчэ дзьве дзяўчыны — Ціханава Дуня і Філіпенка Вара.

Брыгада раненька выяжджала ў поле, старалася поўнасьцю выкарыстоўваць свой рабочы дзень. Улюбёна даглядала коняй, прымацаваных да іх брыгады.

Брыгада падымала цаліну пад лён. Цяжка было першыя дні, ды хіба-ж такая праца ўпяршыню дзяўчатам-камсамолкам? Моцна трымалі плуг у руках, роўна яго накіроўвалі, каб ня было агрэхаў. **30 *га* падняла ўдарная комсамольская брыгада пад лён.**

Ёсьць і такія ў калгасе, якія стараюцца падарваць работу, падсьмейваюцца над ударніцамі, працаваць ня любяць. Напрыклад, Жаркова Мар'я. Яна рэзка падзяляе—гэта маё, а гэта калгаснае, ну, а калі калгаснае, то абы з рук збыць. Не адстае ад Жарковай і рахункавод Патапава Мар'я, яна вельмі неакуратна запісвае працадні ў працкніжкі, без яе не абыходзіцца ніводнае рэлігійнае сьвята, а канцэлярыя ў такія дні пустуе.

Праца лепшых ударніц і калгасьніц павінна быць прэміявана.

Анюта.

Сіроцінскі раён.

Прыступілі да касьбы

Калгасы Бяседавіцкага сельсавету (Касьцюковіцкі раён) сваячасова скончылі веснавую сяўбу і пачалі рыхтавацца да ўборачнай.

Перадавікамі зьяўляюцца калгасы „Іскра" і Чырвоны ўсход".

У калгасе „Іскра" датэрмінова скончан рамонт сенаўборачнага інвэнтару і машын. Калгас ужо прыступіў да касьбы канюшыны і сенажаці. Арганізавана брыгада па вырабе грабель. Вывезена 738 вазоў гною пад жыта. Праполка ільну ў поўным разгары. Шырока разгорнута сацспаборніцтва паміж брыгадамі палольшчыц.

У калгасе „Чырвоны ўсход" вывезен 1.131 воз гною, узарана пад жыта 43 *га*.

У галіне падрыхтоўкі да ўборачнай у хвасьце цягнуцца калгасы: „Прасьвет", „Чырвоны бор" і імя Калініна.

Справай падрыхтоўкі да ўборачнай у аднаасобным сэктары ні сельсавет, ні партячэйка ня цікавяцца. Сельсавет і партячэйка павінны папулярызаваць прыкладную працу калгасаў „Іскра" і „Чырвоны ўсход" і зьвярнуць больш увагі на аднаасобны сэктар.

Ф.

Брыгада Пацей Ганны лепшая ў саўгасе

(Саўгас імя 10-годзьдзя БССР, Любаньскага раёну).

Брыгада № 4 Пацей Ганны складаецца з 5 лепшых работніц-ударніц, якія сапраўды паказваюць у сваёй рабоце бальшавіцкія тэмпы і якасьць.

Брыгада Ганны лепшая з лепшых у саўгасе па пасадцы капусты (гародніны). Не дарма-ж гэту брыгаду занесьлі на чырвоную дошку. Згодна нормы на адну работніцу патрэбна засадзіць капусты 0,07 *га*. Заработак 1 руб. 84 кап. Работніца брыгады Пацей Ганны выпрацоўвае фактычна 0,11 *га*, за што атрымліва 3 руб. 05 кап. Нормы выпрацоўкі перавыконваліся штодзенна.

Брыгада ўзяла на сябе самаабавязацельства—дасягнутых тэмпаў ні ў якім разе ня здаць і на аснове яшчэ шырэйшага разгортваньня сацыялістычных мэтадаў працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва, дамагацца замацаваньня іх і надалей. Брыгада Ганны ў саўгасе карыстаецца заслужаным аўтарытэтам сярод усіх работніц саўгасу.

В.

ПРАПОЛКУ СКОНЧЫЛІ, З ПОСЬПЕХАМ ПРАВОДЗЯЦЬ СЕНАЎБОРКУ

Калгас „Расьсьвет новага жыцьця", Старадароскага раёну 3-га ліпеня скончыў праполку ільну, гароду і пшаніцы. Акучана два разы ўся бульба.

Брыгады Дубік Параскі, Емяльянавай Ганны і Жукавец Мані штодзенна перавыконвалі нормы выпрацоўкі, даючы найлепшую якасьць работы.

Калгас „Расьсьвет новага жыцьця" 25-га чэрвеня распачаў сенаўборку. Скошана 20 *га* сенажаці, убрана 16 *га*.

Брыгады нормы выпрацоўкі перавыконваюць на 25—30 проц.

Мікола Ш.



Тав. Друнін вынаходзец машыны-сало мазьбірацель (Украіна).

В. ЛОСЕУ

Сяброўка ПРАВАДЫРА

(Малюнак з барацьбы за нацыянальнае вызваленьне ў Індакітаі).

Развалiўшыся ў шырокім бамбуковым крэсьле, падстаўляючы сваю галаву і шыю пад электрычны вэер, генэрал-губарнатар грозна маўчаў. Усю раніцу ён быў разлаваны і сярдзіты, як ніколі. Дзесяткі раз грубымі і грознымі ўскрыкамі і аплявухамі ён адганяў хлапчука-анаміта, які бясконца падаваў яму шклянкі халоднай сода-віскі. Многа раз званіў ён па тэлефону, вёў кароткія размовы, але кожны раз рэзка абрываў іх, мармычучы пад нос розную лаянку і праклёны. Ня гледзячы на раньні час, ён пасьпеў ужо выслухаць некалькі рапартаў, але і ад іх яму ня стала лягчэй. Наадварот, з дакладаў начальніка паліцыі, пракурора, ваенных улад і іншых асоб, якія былі спэцыяльна запрошаны ў губарнатарскі палац, было відаць, што становішча надзвычай заблыталася і пакуль што не прадбачыцца нічога добрага.

Бліжэйшая сьвіта генэрал-губарнатара хутка пераняла грозны настрой свайго патрона і ў сваю чаргу крычала і наганяла страх на сваіх падначаленых. Ва ўсіх урадавых установах панавала рэзкая напружаная атмасфэра, ва ўсіх былі нацягнутыя твары, кожны прыслухоўваўся да ўсіх чутак і плётак, стараючыся па-свойму растлумачыць і разабраць нявінную фразу, у якой кожны бачыў нейкі асаблівы сэнс. Цэнтральны тэлеграф напружана працаваў і выклікаў улад асобных гарадоў, заўсёды пытаючыся:

— Ну што, злавілі?

І па праваду нязьменна хутка адказвалі:

— Так, злавілі. Сёньня арыштавалі Iгуэн Тай Хока.

Пракурор з новай весткай сьпяшаўся ў палац, але гэтыя весткі ня радавалі генэрал-губарнатара. Паводле падлікаў вайсковага пракурора за апошнія дні было арыштавана ня менш трохсот асоб і ўсе яны называлі сябе Iгуэн Тай Хок. Іншых імён у гэтых людзей, асуджаных на пагібель пад нож гільятыны, ня было. І тут, у цэнтры паўстаньня, у Іен Бэе, і ў пякучым Ханое, і ў вёсках уздоўж кітайскай мяжы, і на далёкім поўдні, усюды, дзе працавалі ваенныя ўлады, якія атрымалі ад ураду шырокія паўнамоцтвы, усюды, дзе рабіліся дзесяткі і сотні арыштаў, усе затрыманыя, з нейкай дзікай гордасьцю прызнаваліся ў прыналежнасьці да паўстанцаў. Яны ахвотна расказвалі афіцэрам, судзьдзям і нават тым панурым асобам, якім даручана было катаваць арыштаваных, аб рэвалюцыйных мэтах, аб адзінай гарачай задачы ўсіх паўстаўшых „выгнаць французаў у мора“, аб велічы сваёй справы і сваёй партыі. І ўсе яны называлі сябе Iгуэн Тай Хок.

— Яны зьдзекуюцца з нас, з правасудзьдзя, яны плююць на нашы законы,—у соты раз паўтараў генэрал-губарнатар пракурору.

З кожным новым дакладам ён шалеў, вочы наліваліся крывёю, ён са сьціснутымі кулакамі накідваўся на служкаў-анамітаў, спаганяючы на іх сваю злосьць і ярасьць. Але гэта не набліжала разьвязкі, гэта не давала разгадкі да соцень і соцень праведзеных арыштаў. Начальнік тайнай паліцыі і галоўны ваенны пракурор, і асабісты сакратар, і старшыня ваеннага трыбуналу,— усе, каго даводзілася ў гэтыя дні прымаць і выслухоўваць,— усе ў адзін голас запэўнялі, што правадыр паўстаньня Iгуэн Тай Хок арыштаваны і знаходзіцца ў аднэй з турмаў.

— Але дзе, у якой турме?— у соты раз пытаўся губарнатар.— Прывядзеце яго да мяне. Я хачу асабіста паглядзець на яго і плюнуць у яго агідную фізіяномію. Тады я магу са спакойным сумленьнем данесьці ў Парыж аб арышце правадыра.

Аднак, ніхто ня мог задаволіць гэтага натуральнага жаданьня начальніка. Нават правакатары, нават шпікі, рассованыя ва ўсе турмы, і тыя, якія валэндаліся па рынках і вёсках, прыслухоўваліся да ўсіх размоў і прыглядаліся да сваякоў усіх арыштаваных, нават яны не маглі распазнаць правадыра паўстаньня. Губарнатар пагражаў ня даць пэнсіі і наградных, чарговых адпачынкаў і абяцаў накласьці спагнаньні і штрафы. Але і гэта не дапамагло.

Так было некалькі тыдняў, на працягу якіх паўставалі новыя вёскі, і ў розных канцах Індакітаю паўстанцы нападалі на ўрадавыя вартавыя і ваенныя пасты і прадстаўнікоў улады. Генэрал-губарнатар бачыў у гэтым новыя довады таго, што правадыр паўстаньня застаецца на волі і паранейшаму кіруе змаганьнем з французамі. Парыж штодня закідваў тэлеграмамі, патрабуючы рашучых і строгіх мер, і ў першую чаргу *злавіць і сурова* пакараць Iгуэн Тай Хока, гэтага прызнанага ўсімі правадыра нацыянальнага руху, які карыстаўся рэдкай пашанай і вялікім аўтарытэтам сярод тубыльцаў. Чытаючы гэтыя тэлеграмы, генэрал-губарнатар ясна ўяўляў сабе, у якой залежнасьці ён знаходзіцца ад соцень арыштаваных, пасаджаных у турму, катаваных, але якія няўхільна называлі сябе імем правадыра.

З гэтага даволі няпрыемнага становішча вывеў адзін стары кітаец, які меў некаторыя вельмі аддаленыя адносіны да нацыянальных і рэвалюцыйных колаў, сёе-тое ведаў аб руху, хаця ніколі не карыстаўся асаблівым давер'ем дзеячаў руху. Ён даў уладам простую, але дзельную параду, да таго простую і верную, што ўлады былі літаральна зьдзіўлены тым, што гэта думка ня прышла ім у галаву раней. Ён сказаў, што Iгуэн мае каханку, маладую дзевятнаццацігадовую дзяўчыну Тай Гянь, рэвалюцыянэрку, як і правадыр, гарачую нацыяналістку, адданую змаганьню і правадыру. Пільна сочачы за ёю, можна будзе дакладна даведацца, дзе Iгуэн і нават напэўна яго ўдасца злавіць, калі ён усё яшчэ на волі.

Сапраўды, Тай Гянь існавала. Яна і яе старэйшая сястра, Тай Бак, даўно ўжо працавалі ў нацыянальнай партыі, выконваючы рэвалюцыйныя даручэньні і за-

даньні. Тай Гянь была маладая, але ўжо з семнаццаці год яна ведала ўсе пакуты падпольля, усе прыгожасьці славутай французскай калёніяльнай „цывілізацыі“, якая грунтавалася на трупах і косьцях бязьлітасна эксплёатаваных і прыдушаных тубыльцаў. У школе яна дасканала азнаёмілася з духам французскіх калёніяльных традыцый, з атмасфэрай вышэйшых калёніяльных улад, якія часамі прыяжджалі ў школу. Гэта яны падтрымлівалі „сувязь“ з тубыльцамі, абыходзячыся з імі, як паны са сваімі рабамі. Спробы школы вытруціць з яе дух незалежнасьці і нацыяналізму і стварыць з яе прывабную „адукаваную“ нявесту для аднаго з тубыльных стаўленікаў імпэрыялізму — ня мелі посьпеху. Як і ўся моладзь, яна з запалам накінулася на вучэньне, успрыймаючы ўсё, што, ёй здавалася, будзе патрэбна ў будучым змаганьні з ворагам яе народу і краіны. Яна ніколі, ні на хвіліну не сумнявалася, што гэта змаганьне надыходзіць, што ёй прыдзецца прыняць удзел у ім. І яна інстынктам, так разьвітым у тубыльцаў, загадзя згаджалася з гонарам выканаць усё, што рыхтуе ёй рэвалюцыйнае змаганьне.

Аднаго разу, выпадкова, на патаемным сходзе яна спаткала Ігуэна, і гэта спаткаьне вырашыла ўсе яе сумненьні і наперад вызначыла яе далейшы лёс. Тое, што раней яна адчувала і прымала інстынктыўна, атрымала пацьвярджэньне і ўгрунтаваньне ў шматлікіх, хаця і кароткіх, гутарках. Як некалі захаплялася яна вучэньнем, так цяпер яна цэлымі днямі чытала рэвалюцыйныя брашуры і газэты. Разам з сястрой увайшла яна ў падпольны гурток, праяўляла нязвычайную энэргію, гарэла на рабоце, запальвала сваім энтузіязмам іншых.

Ва ўмовах пастаяннай сьлежкі ёй не даводзілася доўга гутарыць з Ігуэнам. Спаткаюцца, перакінуцца дзьвюма-трыма фразамі, і зноў разьвітаюцца на доўгія і доўгія тыдні. Ён ведаў, што яна працуе, што недзе праводзіць гутаркі з моладзьдзю, растлумачвае ім „пра дзень“—той, дзень, калі Індакітай паўстане і зьмяце з зямлі прыгнятальнікаў краіны. А яна вяла любую работу: прымала ўдзел у партыйных газэтах і разносіла праклямацыі па салдацкіх казармах, агітавала па вёсках і ў школах, зьбірала грошы на барацьбу, на куплю зброі, на дапамогу арыштаваным, хавала праклямацыі, давала сваю кватэрку пад патаемныя пасяджэньні. Хутка яна так зжылася з гэтай работай, што ўсе іншыя інтарэсы, усе іншыя мысьлі пакунулі яе. Яе жыцьцё ператварылася ў адзін рэвалюцыйны парыў і, апрача рэвалюцыі, ня было ў яе нічога, нічога. Не... быў яшчэ Ігуэн. Але-ж ён увасабленьне рэвалюцый.

Спатканьні іх былі рэдкімі і кароткімі. Было так многа пра што гаварыць, пра што параіцца і спытаць адзін другога. Але кожны раз асабістае адкладалася; спачатку ішлі размовы аб справе, аб змаганьні, перадаваліся і прымаліся даручэньні, інструкцыі, а потым... трэба было сьпяшацца, разыходзіцца, каб не праваліць канспірацыйнага месца спатканьняў і ня быць злоўленымі шпікамі. Толькі раз яна сказала яму:

— Калі цябе зловяць, ты павінен з гонарам памерці, а я пайду за табой.

За ёй пачалі сачыць. Нябачныя цені хадзілі за ёй па пятах, ня спускаючы з яе вачэй. Дом, у якім яна жыла, зрабіўся небясьпечным. Яна кінула прыходзіць у свой пакой, жывучы і начуючы ў розных прыяцеляў і таварышоў. Яе непакоіла адзеньне. У ім столькі раз бачылі яе шпікі і агенты, што цяпер ім ня цяжка яе пазнаць за некалькі кварталаў. Яна апранулася ў мужчынскае адзеньне, вельмі ўдала ўвёўшы ў зман назіральнікаў. Верныя сябры папярэджвалі яе аб небясьпецы і ў хуткім часе вакол яе стварылася невялікая група, якая ў сваю чаргу назірала за паліцэйскімі і шпікамі. Некаторыя пасябравалі з паліцэйскімі, даведваліся аб іх намерах і планах шпікоў і зараз-жа даносілі ёй. Яна, замятаючы сьляды, паехала з Іен Бэя, блукаючы па вёсках, там яна ўздыхнула крыху вальней.

Улады згубілі яе, але гэта не перашкодзіла ім засудзіць яе завочна і прыгаварыць да пакараньня сьмерцю, таксама як і Ігуэна, які пакутаваў у турме, але ня быў яшчэ распазнаны. Яе гэта радавала. Што можа быць лепш за агульны лёс? Многа раз хацелася ёй пайсьці да ўлад, аддацца ім у рукі і падзяліць лёс з ім. Але кожны раз яе затрымлівала думка, што ён яшчэ не распазнаны, што ёсьць яшчэ надзея на яго выратаваньне для рэвалюцыі, што ён не загіне. Яна не спадзявалася на выратаваньне Ігуэна міласьцю прэзыдэнта краіны, забойцаў і катаў. Надта добра ведала яна калёніяльныя традыцыі прыгнятальнікаў. І калі сябры прабавалі выклікаць у ёй надзею на амністыю, на памілаваньне, яна ўказвала ім шматлікія выпадкі з ранейшых паўстаньняў, выпадкі, у якіх французы зарэкамэндавалі сябе як бязьлітасныя зьвяры. Яна ня верыла ў тое, што ўдасца доўгі час маніць турэмшчыкаў і ведала, што будзе дзень, калі Ігуэн сам выдасьць сябе.

Яна мела рацыю гэта маладзенькая „неспрактыкаваная“ дзяўчына-анамітка. Патаемны і далекі прэзыдэнт зацьвердзіў прыгавор. Ігуэн выдаў сябе, не жадаючы, каб з-за яго мучылі людзей, і лічачы, што сьмерцю сваёй натхніць сяброў на рашучы ўдар па прыгнятальніках.

На пляцы Іен Бэя з ліхаманкавай пасьпешнасьцю будавалі гільятыны. Генэрал-губарнатар парашыў усенародна пакараць мяцежнікаў, каб сьвіст нажа гільятыны адбіў усе мяцежныя помыслы тубыльцаў, каб перадсьмяротныя мукі і енкі пакараных,—а ў гэтым генэрал-губарнатар быў упэўнен—мелі б аздараўляючы ўплыў на тых, што засталіся па міласьці рэспублікі жывымі. Меркавалася абставіць пакараньне як можна больш урачыста, сагнаць на пляц народ, апавясьціць аб пакараньні па ўсіх вёсках.

Цяжкія дні перажывала Тай Гянь. Яна-б хацела загінуць на аднэй гільятыне з ім, каб ворагі ведалі, што змагары за волю нават маладзенькія дзяўчыны, не баяцца гільятыны і могуць памерці з гонарам, каб ён ведаў, што яна выканала сваё абяцаньне і разам з ім аддала сваё жыцьцё за свабоду. Але ў цьвярозыя мінуты яна разважала інакш. Не, яна павінна жыць, жыць ва што-б там ні стала, наперакор сьмяротнаму прысуду, жыць, каб даць жыцьцё яго сыну, каб выхаваць з яго чалавека, які будзе крывава, непадкупна помсьціцца за бацьку, за правадыра, за прыгнечаны народ. Яна ясна ўяўляла сабе, як яна будзе выхоўваць гэтага чалавека, як будзе з дня ў дзень напаўняць яго сьвя-

шчэннай нянавісьцю да імпэрыялістаў, як будзе спакойна, старанна, дакладна падрыхтоўваць дзень помсты.

Гэтыя мысьлі, аднак, зьяўляліся рэдка і хутка адкідаліся ёю. Ня можа жыць яна, калі рэволюцыя раздушана ў патоках крыві, калі правадыр загінуў, а сотні і тысячы іншых змагароў гніюць на катаржных работах. Яшчэ калі-небудзь яе папракнуць, што яна выратавалася, калі іншыя злажылі свае галовы.

І ніякага апраўданьня ў яе ня будзе ні перад імі, ні перад сабою. Яна павінна загінуць, яна павінна падзяліць лёс усіх, лёс правадыра. Але загінуць павінна яна так, каб ворагі не сьвяткавалі перамогі. У гэтым бачыла яна сваю апошнюю задачу...

Змрочным быў дзень пакараньня. Замест радаснага натоўпу народу—азлобленыя, затаіўшыя кроўную крыўду тубыльбы, якіх стрымлівалі выключна вінтоўкамі і бомбамётамі, што ляталі ў паветры. Замест народнага сьвята — усенародны сум, які перарываецца вясёлымі матывамі калёніяльных аркестраў, што ўзбадзёрваюцца і ахоўваюцца танкамі і кулямётамі. Замест публічнага раскаяньня, плачу і просьбаў—гучныя выразы адданасьці справе вызваленьня Індакітаю, праклёны па адрасе катаў, заклікі да паўстаньня і барацьбы. Так загінулі ўсе асуджаныя на пакараньне сьмерцю. Так загінуў Ігуэн Тай Хок.

Невядома, ці была прыяцелька правадыра на пакараньні правадыра. Народная пагалоска гаворыць, што ў натоўпе гледачаў быў малады анаміт, які рэзка нагадваў дзяўчыну, што ня зводзіла вачэй з Ігуэна і, здавалася, гаварыла аб нечым з ім. Але ці была гэта Тай Гянь—невядома.

Ужо складзеная і пашыраная па вёсках лягенда перадае, што Тай прысутнічала на пакараньні, пераапранутая ў мужчынскае адзеньне, што яна ўнушала сваім зрокам Ігуэну бадзёрасьць, сьмеласьць, пагарду да сьмерці, нянавісьць да ворагаў, што вачыма сваімі яна гаварыла яму, што данае абяцаньне выканае хутка, сёньня-ж, што іх сьмерцю змаганьне ня скончыцца, а толькі разгарыцца.

Паводле гэтай лягенды Гянь зараз-жа пасьля пакараньня накіравалася ў родную вёску Ігуэна, але шпікі яе заўважылі і пасьпяшыліся за ёй. Ёй, аднак, удалося абмінуць усе іх заставы і дабрацца да вёскі. Тут яна ўвайшла ў стары храм, дзе столькі разоў бачылася з Ігуэнам, дзе гаварыла з ім аб вызваленьні бацькаўшчыны, дзе распрацоўвала з ім пляны змаганьня і дзе любіла яго. У храме яна пераадзелася ў хаўтурнае адзеньне і прытаілася там. Яна спадзявалася, што паліцэйскія і шпікі, якія прыкідваюцца „багамольнымі", ня будуць шукаць яе ў храме.

Шпікі, узяўшы сабе на дапамогу роту салдат, прышлі ў вёску і зрабілі павальны вобыск. Пераходзячы з кватэры ў кватэру, усюды шукаючы прыяцельку правадыра, яны толькі пад вечар успомнілі аб старажытным храме і калі падыйшлі да яго, — пачулі рэвальвэрны стрэл.

На алтары з прастрэленай скроняй ляжала без адзнак жыцьця, яшчэ цёплая, маладая Тай Гянь, каханка Ігуэн Тай Хока, які ў той-жа дзень быў пакаран на пляцы ў Ін Бэе...

Параход павольна адвозіў чарговую партыю катаржан, засуджаных на ўсё жыцьцё на пасяленьне ў Пулё-Кандор, мясцовасьць, адкуль ніхто не варочаецца. На палубе стаяла ў кайданох Тай Бак, старэйшая сястра Гяні, плачучы аб тым, што няма ў яе атруты або рэвальвэра, каб пакончыць з сабою...

А рота салдат і шпікі, якія ня здолелі злавіць жывую Тай Гянь, палілі, разбуралі і рабавалі вёску, дзе нарадзіўся правадыр і дзе загінула яго прыяцелька. Старыя перабіты, моладзь разышлася па ўсёй краіне, дзяўчыны адданы на зьдзекі салдатам, хібаркі зруйнаваны з зямлёй...



Пабудова кіеўскага сахарнага інстытуту (разьлічанага на 2.000 студэнтаў).

Культмасавая работа ў сталай калгаснай брыгадзе

Выкананьне задачы, высунутай другой пяцігодкай, „ператварэньня ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага грамадзтва“, патрабуе ўзьняцьця культурна-масавай і палітыка-асьветнай работы на значна вышэйшую ступень, карэннай перабудовы гэтай работы і перанясеньня яе ў сталую вытворчую калгасную брыгаду.

Культмасавую работу неабходна накіраваць, галоўным чынам, на перавыхаваньне калгасьніка ў сьвядомага ўдзельніка сацыялістычнага будаўніцтва, узьняцьця працоўнай дысцыпліны і перамананьня прыватна-уласьніцкіх перажыткаў.

Практыка паказвае, што брыгадная форма арганізацыі калгасьнікаў у працэсе вытворчасьці зьяўляецца найлепшай формай сацыялістычнага перавыхоўваньня. Асабліва цяпер, у пэрыяд праполкі і ўборкі патрэбна ва ўсю шырыню разгарнуць культмасавую працу ў брыгадзе. Канкрэтная праца ў гэтым напрамку павінна праходзіць праз прымацаваньне да брыгады партыйца, настаўніка, або камсамольца.

Найлепшай формай разгортваньня культмасавай работы зьяўляюцца: вытворчыя брыгадныя нарады, гурткі пры хатах-чытальнях па аўладаньні тэхнікай, па ўзьняцьці ўраджайнасьці, агразоатэхнічныя, вайсковыя, антырэлігійныя і інш. Да кіраўніцтва імі неабходна прыцягнуць культурныя, тэхнічныя і агранамічныя кадры. Адначасова забясьпечыць хаты-чытальні і клюбы часопісямі, газэтамі і агранамічна-масавай літаратурай, скарыстаць перасовачныя бібліятэкі, работу кніганосцаў і чырвоных чытароў, практыкаваць арганізацыю кніжных выставак, вечароў калгаснай кніжкі і конкурс на лепшага чытара. Мы ўжо маем прыклады ўзорнай пастаноўкі культмасавай работы, так ў калгасах „За ўраджай“ і імя Гея, Асіпавіцкага раёну, штодзенна праводзяцца брыгадныя 5—10-хвілінныя вытворчыя нарады, перад пачаткам і канцом работы, на якіх намячаецца больш рацыянальнае скарыстаньне загрузкі рабочага дня кожнага члена брыгады і падагульваецца праробленая праца за дзень. Гэта садзейнічае хутчэйшай ліквідацыі абязьлічкі і паляпшэньню працоўнай дысцыпліны.

Вытворчыя брыгадныя нарады павінны накіраваць усю ўвагу на вырашэньне наступных баявых задач: распрацоўка плянава-вытворчых заданьняў брыгады, установка севазьмену. Нормы выпрацоўкі і зьдзельная расцэнка працы, тэрміны і тэхніка асобных работ. Распрацоўка дагавораў па сацспаборніцтву, у якія павінны быць уключаны тэмпы работы, тэрміны яе сканчэньня, працоўная дысцыпліна, прадукцыйнасьць працы і інш. Стымулам лепшага ажыцьцяўленьня абавязацельств па сацспаборніцтву зьяўляецца прэміяваньне лепшых калгасьнікаў.

Найвышэйшымі формамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва зьяўляецца сацбуксір і дзенны сустрэчны плян. Галоўнае значэньне сустрэчнага пляну заключаецца ў тым, што калгасьнікі пасьля ўсебаковага абмеркаваньня пляну на вытворчых нарадах высоўваюць сустрэчны павялічаны плян, які забясьпечвае садзейнічае актыўнасьці і самадзейнасьці калгасных мас. Мы маем рад прыкладаў, калі калгасы, дзякуючы сацспаборніцтву, ударніцтву і сустрэчнаму плянаваньню, сваячасова выконвалі і перавыконвалі свае першапачатковыя пляны і заданьні. Такімі калгасамі зьяўляюцца „Прамень“, Чырвона-Слабодзкага раёну, які перавыканаў плянавае заданьне па сяўбе на 20 проц., калгас імя Сталіна, Магілеўскага раёну, перавыканаў плянавае заданьне па сяўбе тэхкультур на 100 проц.

Стымулам узорнай работы калгасных брыгад і асобных калгасьнікаў у барацьбе за высокую ўраджайнасьць зьяўляецца правільнае тлумачэньне пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 II—32 году, якая гаворыць: „ацэнка працадня павышаецца або паніжаецца ў залежнасьці ад выникаў работы брыгад. Тыя брыгады, якія будуць даваць большую ўраджайнасьць, чым указана ім па пляне, будуць атрымліваць пры разьмеркаваньні прыбыткаў у канцы году больш высокую ацэнку, чым тыя брыгады, якія ў выніку дрэннай работы дадуць паніжаную ўраджайнасьць, такім чынам ацэнка працадня ў калгасах будзе ўстанаўляцца на аснове агульнага даходу калгасу і ў залежнасьці ад выникаў работы кожнай брыгады“.

Гэтай пастановай неабходна кіравацца пры арганізацыі праполачных і ўборачных работ у кожнай брыгадзе і пры арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Саўгас ЗРК „Чырвоны сьцяг“ прадае на рынку расаду памідор.

Вялікую дапамогу ў разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва аказвае нізавы калгасны друк, бюлетэні і брыгадныя насьценгазэты - штодзенкі. Цэнтральнай задачай брыгадных газэт зьяўляецца барацьба за высокія тэмпы і за якасьць сацыялістычнай гаспадаркі, за аўладаньне агратэхнікай, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасу.

На аснове сацмэтадаў працы і рэгулярнага выхаду штодзенкі, калгас імя Сталіна, Магілеўскага раёну, скончыў сяўбу да 25-га мая з перавыкананьнем пляну тэхкультур на 100 проц. і узяў на буксір адстаючы суседні калгас імя Чарвякова. За добрую работу калгас імя Сталіна прэміяваны радыё-ўстаноўкай і прамтаварамі на 1.500 руб. Дзьве калгасьніцы-ўдарніцы Фурс Марфа і Нізаўцова пасланы ў дом адпачынку. У калгасе „Новы селянін", Стара-Дароскага раёну, значную ролю ў пасьпяховым змаганьні за сяўбу адыграла брыгадная штодзенка „На штурм", выяўляючы лепшых ударнікаў і бязьлітасна бічуючы лодыраў і прагульшчыкаў, штодзенка дабілася 100-проц. выхаду калгасьнікаў на працу, зьнішчэньня прагулаў і поўнай ліквідацыі абязьлічкі.

У правядзеньні важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній на вёсцы калгасны актыў адыгрывае значную ролю і таму вялізарнае значэньне набывае выхаваньне калгаснага актыву з лепшых калгасьнікаў і калгасьніц. Брыгадзір павінен умець арганізоўваць вакол сябе ядро перадавых калгасьнікаў.

Вялікім тормазам у працы зьяўляецца малапісьменнасьць і недастатковая падрыхтоўка саміх брыгадзіраў. Паводле вестак 992 калгасаў у БССР на 1-VI—32 году ёсьць усяго з сярэдняй асьветай брыгадзіраў 0,6 проц., з ніжэйшай—45,5 проц., хатняй—20,6 проц., малапісьменных—30,4 проц., скончыўшых спэцкурсы—44 і іншыя—8,6 проц.

Неабходна яшчэ адзначыць, што вылучэньне жанчын у брыгадзіры ідзе вельмі слаба. У калгасах БССР ёсьць прыкладна 3,3 проц. жанчын-брыгадзіраў—гэта зусім нізкая лічба гаворыць аб тым, што жанчыну яшчэ недаацэнілі і не падрыхтавалі, як брыгадзіра. Між тым, практыка калгаснай работы ўжо паказала шмат прыкладаў актыўнага ўдзелу жанчын у вытворчасьці і грамадзкай працы. У радзе калгасаў ударныя жаночыя брыгады паказалі больш высокія нормы выпрацоўкі, чым мужчыны.

Неабходна больш рашуча вылучаць жанчын на розныя курсы, у тэхнікумы і інш. навучальныя ўстановы, уцягваючы іх у работу аграрытворчых нарад, гурткоў, дзе калгасьніцы змаглі-б атрымаць належную кансультацыю па тых ці іншых пытаньнях. Патрэбна больш рашуча вылучаць лепшых калгасьніц-ударніц на работу ў якасьці брыгадзіраў. Вялікую ролю ў гэтым павінны адыграць ясьлі, пляцоўкі і ўстановы грамадзкага харчаваньня, якія аслабаняць калгасьніцу ад хатніх клопатаў і даюць магчымасьць прынімаць больш актыўны ўдзел у калгаснай вытворчасьці.

Правільна пастаўленая культмасавая праца ў брыгадзе дапаможа мабілізаваць калгасныя масы на актыўны ўдзел у сацыялістычнай сельска-гаспадарчай выгворчасьці, на перамогу дробна-ўласьніцкіх буржуазных тэндэнцый, на барацьбу з вылазкамі клясавага ворага, які заўсёды імкнецца сарваць мерапрыемствы партыі і ўраду.

Р. У.

Масавую працу на поле, у брыгаду

Сенаўборка ў калгасе „Новы сьвет" (Смалявічы) у самым разгары. Калгас ужо набыў неабходныя сельскагасподарчыя машыны—сенакасарку і грабілку, якія вызвалілі людзей ад цяжкай працы, ужо скошана *7 га* цімафееўкі. Добрае надвор'е спрыяе сушцы сена і добрай якасьці яго.

Ударнымі тэмпамі праходзіць у калгасе і поліва, асабліва ільну і гародніны. На аснове разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, нормы, вызначаныя па праполцы, перавыконваюцца. Асабліва ўдарна працуюць калгасьніцы **Лягуш Надзя, Кудзіна Юста, Маліноўская Лена і Маліноўская Стэпа.** Яны зьяўляюцца лепшымі ўдарніцамі па поліве.

Разгорнута падрыхтоўка да ўборачнай, адрамантаваны хамуты, калёсы. Рамантуецца ўборачны інвэнтар і машыны. Добрая праца калгаснай сталоўкі спрыяе выкананьню вытворчых заданьняў.

Культурна-масавая праца ў калгасе пастаўлена вельмі дрэнна. Дэлегацкі сход з 1931 году працы не распачаў. Партыйная ячэйка зусім не зварачвае ўвагі на разгортваньне работы сярод жанчын і наогул масавай работы ў калгасе.

Партячэйка павінна неадкладна прыступіць да рэалізацыі пастаноў ліпеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб партыйна-масавай рабоце і пастановы ЦК УсеКП(б) аб працы дэлегацкіх сходаў.

Аня.

Праполачная—у разгары

У калгасе „На варце" (Крычаўскі раён) шырока разгорнута праполачная. 60 жанчын заняты па праполцы гароду ў 63 *га*. Другая жаночая брыгада занята палівам бульбы, да яе прымацаваны коні з інвэнтаром і прыладамі.

Трэцяя брыгада працуе па праполцы тэхнічных культур і пшаніцы.

Паміж брыгадамі разгорнута сацспаборніцтва, што зьяўляецца зарукай сваячасовага выкананьня плянаў праполачнай.

Галя.

Яслі камуны „Чырвоная зорка" Пухавіцкага раёну.

17/62/XII

У БАРАЦЬБЕ ЗА ПЯРШЫНСТВО Ў КОНКУРСЕ

УДАРНІЦЫ-СЬВІНАРКІ

СТФ калгасу „1-е мая“ (Слуцкі раён) зьяўляецца лепшай фэрмай у раёне.

Сьвінаматак фэрма налічвае 101, кныроў—6, парасят да 2-х месяцаў—220, бэконных—17 і малых парасят—157. СТФ заканктрактавала 100 парасят, з якіх ужо частку здала.

Плян здачы (продажу) дзяржаве калгас выканаў на 150 проц.

На СТФ працуе брыгада з 13 чалавек, з іх 10 жанчын. Паміж працуючымі на фэрме шырока разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Лепшай ударніцай арганізатарам сацспаборніцтва зьяўляецца тав. Цыганава.

На сьвінарніку выдаецца свая насьценгазэта „За сацыялістычную сьвінагадоўлю“. Дзякуючы сацыялістычным мэтадам працы і разгорнутай крытыцы і самакрытыцы СТФ дабілася значных дасягненьняў.

Абязьлічка поўнасьцю ліквідавана, да кожнай сьвінаркі прымацавана пэўная колькасьць сьвіней. Уведзен добры ўлік працы, кожныя пяць дзён запісваюцца працадні ў кніжку калгасьніцам. Адыход маладняка ў мінулым годзе даходзіў да 35 проц., а зараз адыход маладняка зусім ліквідаван. Добра наладжана кармленьне сьвіней, што дае вялікі прырост прадукцыі.

У часе веснавога апаросу жанчыны наладзілі начныя дзяжурствы, што таксама забясьпечыла захаваньне маладняка.

На сьвінарніку шырока разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва. СТФ заключыла сацумову з МТФ. Жанчыны, працуючыя на СТФ, замацавалі сябе на цэлы год працы на фэрме. Лепшымі ўдарніцамі на фэрме зьяўляюцца тав. Цыганава, Падліпная, Ганчар, Гарбунова, Шэўчук і падвозчык кармоў т. Брэўда.

СТФ калгасу „1-е мая“ выйдзе ў першыя гады ў конкурсе на лепшага сьвінара. За добрую работу СТФ калгасу „1-е мая“ райкалгассаюзам занесена на чырвоную дошку. Зараз СТФ змагаецца за выкананьне ўмоў конкурсу.

Ударніцы-сьвінаркі не павінны здаваць тэмпаў працы па выкананьні ўмоў конкурсу, яны і надалей павінны па-ўдарнаму змагацца за пяршынства ў конкурсе.

Я.

ПРАЎЛЕНЬНЕ НЯ ЦІКАВІЦЦА ПРАЦАЙ СТФ

Праўленьне калгасу „Тружанік“, Астроцкага сельсавету, Лагойскага раёну, недаацэньвае працу сьвінагадоўчай фэрмы. Фэрма кармамі не забясьпечана. Сьвінаркам прыходзіцца хадзіць за 2-3 кілёмэтры за кормам, на што траціцца вельмі многа часу.

Плян па пасеве раньніх траў, а таксама па бульбе выканан толькі на 45 проц. Калгас ня мае сячкарні. Сьвінаркі ходзяць па дварох рэзаць траву для сьвіней у той час, як калгас можа набыць сабе сячкарню. З-за адсутнасьці належнага догляду сьвіней, у зімовы час адыход маладняка даходзіў да 40 проц.

У сучасны момант сьвінафэрма мае 46 сьвінаматак, з іх пяць матак засталіся непароснымі. Згодна пляну патрэбна было паставіць на фэрме 100 сьвінаматак.

Сьвінафэрма ўключылася ў конкурс на лепшага сьвінара і сьвінарку, але-ж за выкананьнем канкрэтных абавязкаў, узятых па конкурсу, ніхто ня сочыць і яны ня выконваюцца.

Праўленьне калгасу ніводнага разу не заслухоўвала пытаньня аб працы СТФ. Фэрма да гэтага часу не пераключылася на брыгадны мэтад работы, пануе поўная абязьлічка ў доглядзе за жывёлай.

На фэрме працуюць тры камсамолкі—ударніцы-сьвінаркі, праўленьне калгасу ня ведае сваіх ударніц і вопыт іх працы другімі не скарыстоўваецца. Райкалгассаюз павінен прымусіць праўленьне калгасу „Тружанік“ перабудаваць сваю працу па новаму і зьвярнуць асаблівую ўвагу на працу фэрмы.

Таня.

Змагары за сацыялістычную жывёлагадоўлю

У саўгасе „Сінча“ ёсьць буйная сьвіна-таварная фэрма, адна з буйнейшых у раёне. У ёй налічваецца ўсяго 1.158 штук пагалоўя.

У сьвінацэху ўведзена прэміяльна-прагрэсыўная аплата працы па доглядзе сьвіней, што дало падняцьце прадукцыйнасьці працы.

На фэрме добрае санітарнае становішча. Сьвінарнікі чысьцяцца і мыюцца амаль кожны дзень. Карыты мыюцца пасьля кармленьня. На пашу сьвіньні выганяюцца сваячасова. На фэрме няма непаросных матак. За час уключэньня ў конкурс фэрма мае вялікія дасягненьні, калі раней процант адыходу маладняка складаў 37 проц., то за апошнюю дэкаду зьнізіўся да 3 проц. Камплектуецца стада за лік выхаваньня свайго маладняка.

Рабочыя сьвінацэху павінны не здаваць тэмпаў барацьбы за сацыялістычную сьвінагадоўлю, яны павінны змагацца за пяршынство ў конкурсе.

Г. К.

Пухавіцкі раён.

Процівачумная прывіўка парасяці

Работніцы швэйнай фабрыкі імя Крупскай:
ЗМАГАЮЦЦА ЗА ДРУГУЮ ЎМОВУ ТАВ. СТАЛІНА

Швэйная фабрыка імя Крупскай (гор. Менск) сваячасова уключылася ў сталінскі паход. Арганізавалі штаб па кіраўніцтву паходам, склалі тры брыгады ў колькасьці 33 работніц і накіравалі брыгаду в 22 работніц на скарняжную фабрыку імя 1-га Мая па дапамозе правядзеньню сталінскага паходу.

Па лініі ЗРК—адкрыты два загатоўчыя пункты, пашырана і адрамантавана крама. Заключан дагавор з саўгасам „Чырвоны маяк" на дастаўку гародніны і іншых прадуктаў. Арганізован трусятнік, ужо маецца 19 трусаматак і 20 штук маладняка. Праведзена пашыраная нарада з каапактывам па пытаньні сталінскага паходу, арганізавана вітрына браку і вітрына лепшага ўдарніка.

Па сталоўцы—дабіліся водпуску 30 дыэтабедаў, сталы пасланы новымі цыратамі, зьменена старае начыньне, сярод рабочых сталоўкі прапрацавана пастанова ЦА аб грамадзкім харчаваньні.

Работніцы прымаюць актыўны ўдзел ня толькі ў паляпшэньні харчаваньня у сябе на фабрыцы, але і актыўна ўдзельнічаюць у барацьбе за лепшы ўраджай у падшэфным саўгасе. У часе пасеўнай кампаніі штодзенна на працу выходзіла 35—40 работніц.

Дзякуючы практычнай дапамозе з боку работніц фабрыкі саўгас сваячасова скончыў сяўбу і прэміяваў чатырох лепшых ўдарніц: т.т. Ясьнінскую, Шніц, Станкевіч і Мітнік.

Саўгас штодзенна дастаўляе на фабрыку малако для дзяцей рабочых.

Дзіцячыя ясьлі ўключыліся ў сталінскі паход, перайшлі на кругласутачную працу, што дае работніцам магчымасьць выконваць свой прамфінплян.

Пры фабрыцы пабудавана летняе культ-кафэ, а таксама будуецца інтэрнат для рабочых і шавецкая майстэрня.

Побач з дасягненьнямі ёсьць яшчэ шмат недахопаў; сталоўка недастаткова разгарнула працу па загатоўках. Рабочыя сталоўкі не праведзены на зьдзельшчыну. Паміж паварамі пануе абязьлічка. Не ўстаноўлен бракераж абедаў. Якасьць абедаў яшчэ ня зусім адпавядае запатрабаваньням рабочых. У сталоўцы брудна, рабочым падаюцца брудныя лыжкі. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж работнікамі сталоўкі адсутнічае. Насьценгазэта не выпускаецца. Мэдпункт не разгарнуў культасьветную працу ў сталоўцы, як-та: чытка лекцый, гутарак сярод рабочых у часе абедзенага перапынку.

У сталоўцы не арганізован стол ўдарніка. Сталоўка пры фабрыцы павінна зараз-жа пераключыцца працаваць па-новаму ў адпаведнасьці з рашэньнямі апошніх пастаноў партыі.

Разгарнуць самазагатоўкі, заключыць з калгасамі дагавары, перавесьці сталоўку на зьдзельную працу. Штодзенна праводзіць паміж работнікамі сталоўкі абгаварэньне якасьці абедаў. Палепшыць санітарнае становішча сталоўкі.

Брыгада часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі" Грумбіна, Язьмір, Гурэвіч і Гельфанд.

ЧАСОПІСЬ—У МАСЫ

Маткі дзяцей яўрэйскага дзіцячага саду гораду Крычава падпісаліся на 5 месяцаў на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі". Яны сказалі, што „кожная работніца і працоўная жанчына павінны абавязкова чытаць сваю часопісь".

Маткі дзіцячага саду выклікалі на сацспаборніцтва на лепшае распаўсюджаньне часопісі матак усіх іншых дзіцячых устаноў гораду і жонак вайсковых служачых.

Галя.

ЗДАВАЙЦЕ

ПАДПІСКУ
НА ЧАСОПІСЬ

РАБОТНІЦА І КАЛГАСЬНІЦА
БЕЛАРУСІ

ЛІСТАНОСЦАМ
АБО
НА ПОШТУ

ЧАСОПІСЬ
ВЫХОДЗІЦЬ
3 РАЗЫ
Ў МЕСЯЦ
КАШТУЕ 20 КАП.

АДРАС РЭДАНЦЫІ:
МЕНСК, ШАВЕЦКАЯ 63,
3-І ПАВЕРХ, ПАКОЙ № 11.

1233

Выданьне ЦК КП(б)Б. Час. вык. абав. рэдактара В. БУЛКО

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 1639. У ліку 12.100 экз. Уп. Галоўлітбелу № А—4

206618